ЛіМ

# Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 47 (5053) 6 снежня 2019 г. ISSN 0024-4686

16+

*Несуцяшальныя інтанацыі Кірыла Стаселькі стар. 6*

*Акцэнт — на пластычныя пастаноўкі стар. 13*

*Журналістыка: хто вядзе рэй? стар. 15*

# Унікальная спадчына

## Музей Якуба Коласа святкуе 60-годдзе

*Фота Кастуся Дробава.*

У снежні Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа святкуе юбілей. З гэтай круглай датай калектыў установы павіншаваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка.

Невялікі двухпавярховы будынак на тэрыторыі Нацыянальнай акадэміі навук — гэта сапраўды дом пісьменніка, дзе ён жыў з сям'ёй з канца 1944 года да апошніх дзён. А ў 1956-м, пасля смерці народнага паэта, арганізацыяй мемарыяльнай прасторы займаўся старэйшы сын Коласа Даніла. За гэтыя гады праведзена вялікая работа па ўвекавечанні памяці легендарнага заснавальніка новай беларускай літаратуры. Сёння музей Якуба Коласа — гэта 10 экспазіцыйных залаў, у дзвюх захаваны прыжыццёвы інтэр'ер кабінета і спальні пісьменніка. У астатніх пакоях — мэбля і рэчы, якімі карыстаўся паэт на працягу апошніх гадоў свайго жыцця.

Асноўны фонд музея налічвае звыш 31 тысячы адзінак. Гэта асабістыя рэчы Якуба Коласа і яго сям'і, кнігі, рукапісы, дакументы, мастацкія работы, якія ўвекавечваюць вобраз народнага паэта і герояў яго твораў. У музеі таксама маюцца і неарыгінальныя, дублетныя матэрыялы (рэпрадукцыі, копіі, муляжы), з якіх створаны навукова-дапаможны фонд колькасцю звыш 4 тысяч адзінак.

Працяг на стар. 4

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 19047

## акцэнты тыдня

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў калектыў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа з 60-годдзем з дня заснавання ўстановы. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што ўнікальныя экспазіцыя залаў, разнастайныя праекты і праграмы музея вабяць наведвальнікаў, раскрываюць перад імі шматгранны вобраз знакамітага земляка. «Сёння ўстанова — своеасаблівы цэнтр айчыннай культуры, месца, дзе беражліва захоўваецца гісторыя жыцця і дзейнасці песняра — класіка, які ўнёс вялікі ўклад у фарміраванне літаратурнай мовы і патрыятычнай свядомасці беларускага народа», — гаворыцца ў віншаванні. Аляксандр Лукашэнка пажадаў калектыву рэалізацыі новых ідэй і планаў: «Упэўнены, што ваш няспынны творчы пошук, энтузіязм і захопленасць справай будуць і ў далейшым садзейнічаць папулярызацыі багатай спадчыны нашай краіны».

Праект. У Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы адбылася прэзентацыя выдання «Янка Купала. Санеты». Кніга, створаная па ініцыятыве музея, пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў 2019 годзе. Пад вокладкай сабраны ўсе санеты Янкі Купалы, а таксама пераклады, зробленыя спецыяльна для выдання і апублікаваныя ўпершыню. У беларускай паэзіі Янка Купала быў адным з першых, хто стала ўвёў гэты жанр у сваю мастацкую палітру, надаўшы яму непаўторнае, купалаўскае, гучанне. Новыя пераклады санетаў Янкі Купалы сведчаць пра жывую цікавасць да беларускай класікі ў свеце, пра творчы пошук паразумення, калі мова мастацкага твора дзякуючы рупліўцам-перакладчыкам становіцца пачаткам сяброўскага дыялогу паміж народамі і краінамі. Укладальнікі кнігі — міністр інфармацыі Рэспублікі Беларусь Аляксандр Карлюкевіч і дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч.

Перспектывы. Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы выпусціў першы нумар свайго часопіса «Купалаўскі». Паводле слоў генеральнага дырэктара тэатра Паўла Латушкі, сённяшні глядач — крэатыўная асоба, якая думае, аналізуе і з'яўляецца не толькі назіральнікам на фабрыцы спектакляў: «Мы шукаем розныя формы, каб узаемадзейнічаць з нашай аўдыторыяй». Паводле Паўла Латушкі, да 100-годдзя Купалаўскага тэатра рыхтуецца кніга, ствараюцца плакаты, а таксама 10 відэаролікаў. Кіраўнік тэатра адзначыў, што спектакль «Паўлінка» плануецца ўнесці ў спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей. «Спадзяёмся на падтрымку Міністэрства культуры і ўрада нашай краіны. Акрамя таго, мы падаём заяўку ў Кнігу рэкордаў Гінеса. Тут пакуль няма такой намінацыі, але, калі атрымаецца змяніць правілы або ўнесці дапаўненні, спадзяёмся, што ўбачым нашу "Паўлінку" ў кнізе», — падзяліўся планамі гендырэктар.

Векапомнае. Літаратурна-дакументальная экспазіцыя «Залатая раніца беларускага адраджэння» адкрылася ў Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры. Экспазіцыя раскрывае літаратурны працэс Беларусі ў 1920-я гг. праз дэманстрацыю матэрыялаў, звязаных з галоўнымі літаратурнымі згуртаваннямі таго часу — «Маладняк», «Узвышша», «Полымя», БелАПП. Акрамя таго, тут змешчаны рэдкія дакументы з Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва, кніжныя выданні бібліятэчкі часопіса «Маладняк» з фондаў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Праект прысвечаны пісьменнікам-юбілярам 2019 года: А. Бабарэку, М. Лынькову, А. Якімовічу, М. Хведаровічу, П. Трусу, А. Дудару, З. Аксельроду, С. Дарожнаму, В. Маракову, Л. Калюгу, М. Лужаніну, З. Бандарынай, А. Куляшову.

**Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ**

## У Саюзе пісьменнікаў Беларусі

# Дзеля духоўнага развіцця

Урачыстасці з нагоды 90-годдзя навукова-метадычнай установы «Нацыянальны інстытут адукацыі» Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адбудуцца сёння ў ліцэі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Саюз пісьменнікаў Беларусі накіраваў інстытуту-юбіляру прывітальны адрас, у якім адзначана, што да гэтай падзеі спрычынены пакаленні прафесіяналаў, тых, хто прысвяціў свой лёс клопату аб выхаванні сапраўдных беларусаў.

Да калектыву Нацыянальнага інстытута адукацыі ад імя Прэзідыума Саюза пісьменнікаў Беларусі звярнуўся яго старшыня Мікалай Чаргінец: «Надзвычай важным у працэсе выхавання асобы мы лічым наша супрацоўніцтва, — падкрэслена ў віншаванні СПБ. — І падтрымліваем інстытут у тым, што ў аснове нават самых перадавых метадаў навучання застаюцца каштоўнасці, якія фарміруюць у моладзі найлепшыя чалавечыя пачуцці, вучаць любіць Радзіму, асэнсоўваць сябе яе часцінкай. Мова, кніга, літаратура дазваляюць юным беларусам рабіць адкрыцці ў свеце нязведанага. Саюз пісьменнікаў Беларусі ўдзячны Нацыянальнаму інстытуту адукацыі за ўважлівае стаўленне да айчыннай літаратурнай спадчыны, пільную ўвагу да сучаснага літаратурнага працэсу. Сведчаннем таму — падручнікі новага ўзору. Будзем і надалей разам спрыяць духоўнаму развіццю маладога пакалення, за якім — будучыня Беларусі. Краіна будзе такой, якой створым яе самі».

**Марыя ЛІПЕНЬ**

# Нагода — юбілей Саюзнай дзяржавы

Члены Саюза пісьменнікаў Беларусі і Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы Міхась Пазнякоў, Мікола Кузняцоў і Віктар Ермаловіч узялі ўдзел у імпрэзе, прымеркаванай да 20-годдзя Саюзнай дзяржавы, якая адбылася на факультэце права Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта.

Пісьменнікі распавялі пра сябе і сваю творчасць, заклікалі студэнтаў паспрабаваць свае сілы ў напісанні літаратурных твораў.

Яшчэ адной прыемнай нагодай для таго, каб сустрэцца і паразмаўляць пра літаратуру, стаў дзень нараджэння аднаго з гасцей — Міколы Кузняцова, які з задавальненнем выступіў перад аўдыторыяй будучых юрыстаў і выкладчыкаў, распавёў пра свае кнігі, сярод якіх — работы па гісторыі, паліталогіі, паэтычныя зборнікі.

Пісаць вершы Мікола Васільевіч пачаў ужо ў сталым узросце пад псеўданімам Алесь Вабіч. Некаторыя з іх аўтар прадэкламаваў і быў узнагароджаны шчырымі апладысментамі. Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў уручыў Міколе Кузняцову медаль Максіма Багдановіча за шматгадовую плённую працу ў галіне публіцыстыкі.

**Алена БАРЭЦКАЯ**

# Кардыяграма творчасці

*Фота Васіля Купкова.*

У Мінскім гарадскім тэатры паэзіі, створаным сталічным аддзяленнем СПБ пры Цэнтральнай бібліятэцы імя Янкі Купалы, адбылася творчая сустрэча з Эдуардам Ханком, народным артыстам Беларусі, заслужаным дзеячам мастацтваў, членам Саюза пісьменнікаў Беларусі, аўтарам цікавых навукова-пазнавальных кніг.

Прачулае слова пра калегу выказаў на пачатку імпрэзы старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ, дырэктар Тэатра паэзіі Міхась Пазнякоў. Слухачы горача вітала шчырымі апладысментамі, бадай, кожнае слова, кожную песню кампазітара. Эдуард Сямёнавіч распавёў пра творчы шлях, супрацоўніцтва са знакамітымі кампазітарамі і спевакамі, выканаў хіты. Пасля пазнаёміў прысутных з новай дзейнасцю — навукова-прыкладной, датычнай абгрунтавання папулярнасці дзеячаў культуры.

Падобныя сустрэчы з прыхільнікамі таленту Эдуарда Ханка пройдуць у іншых установах культуры і адукацыі нашай сталіцы. Наступны год для творцы юбілейны.

**Павел КУЗЬМІЧ**

## віншуем!

# Адзначаны медалямі

**Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас уручыў дзяржаўныя ўзнагароды прадстаўнікам розных сфер нашай краіны.**

Прыемна, што сярод узнагароджаных былі і прадстаўнікі Саюза беларускіх пісьменнікаў — Іван Юркін, Віктар Шніп, Анатоль Зэкаў, Уладзімір Ягорычаў.

У кожнага з іх — свой творчы напрамак, падмацаваны здабыткамі ў паэтычным і песенным жанрах, дзіцячай літаратуры, гістарычнай тэматыцы. Унёсак нашых калег у духоўную скарбніцу Беларусі адзначаны медалямі Францыска Скарыны. Віншуем! Жадаем творчага плёну і надалей!

**Марыя ЛІПЕНЬ**

# Літаратурны цэнтр краіны

**З нагоды 60-годдзя з дня адкрыцця экспазіцыі Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа Саюз пісьменнікаў Беларусі віншуе калектыў установы з юбілеем.**

Ад імя Прэзідыума ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі» старшыня Мікалай Чаргінец адзначыў, што за гэтыя гады музей стаў не толькі месцам захавання памяці выдатнага беларускага Песняра, але і найважнейшым літаратурным цэнтрам краіны, пляцоўкай для сустрэч і імпрэз, зносін пісьменнікаў і чытачоў.

«Тут усё прасякнута духам творчасці, тут лунае атмасфера дакранання да вытокаў айчыннай літаратуры, — гаворыцца ў віншаванні. — Наведванне музея натхняе, настройвае на пазітыўны лад. Музей Якуба Коласа — сапраўдны храм культуры.

Вітаем удзельнікаў штогадовага культурнага свята "Каласавіны", якое традыцыйна збірае даследчыкаў жыцця і творчасці народнага паэта, усіх прыхільнікаў мастацкага слова.

Ад імя членаў Саюза пісьменнікаў Беларусі жадаем, каб у Дом Коласа "гужом ішоў чытачоў мільён", каб у іх душах прарастала зерне з багатага паэтычнага коласа».

## прэміі

# Беларусы — у «Сузор'і Духоўнасці»

**Па выніках III Міжнароднага літаратурнага конкурсу «Сузор'е Духоўнасці» — 2019, які праводзіцца ва Украіне, узнагароджаны:**

**Міхаіл Пазнякоў — медалём «Багдан Хмяльніцкі»** за важкі ўклад ва ўмацаванне творчых сувязяў паміж пісьменнікамі Беларусі і Украіны, а таксама за высокія творчыя дасягненні.

**Уладзімір Тулінаў — ордэнам «Рыцарскі Крыж»** за шэраг публікацый апошніх гадоў у выданнях Украіны, у прыватнасці ў альманаху «Украіна — Беларусь».

**Наталія Касцючэнка — медалём «Украінська берегиня»** за ўмацаванне сяброўскіх сувязяў паміж пісьменнікамі Беларусі і Украіны, а таксама за высокі ўзровень літаратурнага майстэрства.

**Наталля Саветная — медалём «За служіння мистецтву»** за кнігі апошніх гадоў і важкі ўклад у арганізацыю конкурсу імя Ігара Грыгор'ева.

**Аляксандр Раткевіч — медалём «За служіння мистецтву»** за высокі ўзровень арганізацыі фестывалю «Цэнтр Еўропы» і важкі ўклад ва ўмацаванне сяброўскіх сувязяў паміж пісьменнікамі Беларусі і Украіны.

**Лізавета Палеес — медалём «Украінська берегиня»** за плённую шматгадовую дзейнасць на ніве літаратуры і творчыя дасягненні.

**Мінскае гарадское аддзяленне СПБ запрашае:**

***7 снежня*** *— на сустрэчу з Уладзімірам Скарынкіным у СШ № 191 (11.00).*

***9 снежня*** *— на прэзентацыю літаратурна-гістарычнага часопіса «Аляксандр» № 10 з удзелам беларускіх аўтараў у бібліятэку № 21 (14.00).*

***9 снежня*** *— у студыю юных літаратараў «Малінаўскія галасы» ў бібліятэку № 15 (16.00).*

***10 снежня*** *— у літаратурную гасцёўню «Пад беламі крыламі» з удзелам Іны Фраловай і Алены Стэльмах у СШ № 173 (11.30).*

***10 снежня*** *— у Школу юнага паэта пры аддзяленні СПБ (вул. Фрунзэ, 5, каб. 309) (14.00).*

***11 снежня*** *— на сустрэчу з Эдуардам Ханком у літаратурны клуб «Шчырасць» пры бібліятэцы № 22 (16.00).*

***12 снежня*** *— на сустрэчу з Нінай Галіноўскай у СШ № 53 (14.00).*

**Віцебскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***10 снежня*** *— на канцэрт «Малая радзіма вялікіх і слынных людзей» з удзелам Мікалая Балдоўскага і Галіны Загурскай у Наваполацкую цэнтральную бібліятэку імя У. Маякоўскага (18.00).*

**Гродзенскае абласное аддзяленне СПБ запрашае:**

***10 снежня*** *— на сустрэчу з Людмілай Кебіч «Зямля, дзе пачаўся мой лёс» у бібліятэку Гродзенскага гуманітарнага каледжа (14.00).*

***11 снежня*** *— на «Снежаньскія чытанні», прысвечаныя 128-й гадавіне паэта, з удзелам гродзенскіх літаратараў у Музей Максіма Багдановіча (16.30).*

***12 снежня*** *— на сустрэчу Людмілы Кебіч з бібліятэкарамі вобласці ў Гродзенскі абласны метадычны цэнтр народнай творчасці (10.40).*

праекты

# Калядныя чытанні

## Памяць пра спадчыну і размовы пра спадчыннікаў

**У час, калі Беларусь знаходзіцца паміж дзвюма важнымі датамі — 75-годдзем вызвалення Беларусі і 75-годдзем Вялікай Перамогі — асвятленне гэтай тэмы ахоплівае ўсе магчымыя крыніцы.**

Да пытання звярнуліся і арганізатары V Беларускіх Калядных чытанняў, якія прайшлі напрыканцы лістапада і мелі агульную тэму «Вялікая Перамога: спадчына і спадчыннікі».

Традыцыйныя ўжо чытанні арганізоўвае Беларуская праваслаўная царква пры падтрымцы шэрагу міністэрстваў: культуры, аховы здароўя, адукацыі, працы і сацыяльнай абароны, а таксама Нацыянальнай акадэміі навук Рэспублікі Беларусь. Раней яны закраналі толькі сферу адукацыі, але цяпер запрашаюцца прадстаўнікі розных галін. Сярод удзельнікаў семінара пачэснымі гасцямі былі супрацоўнікі шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны і сацыяльныя работнікі.

Адкрыццё праходзіла ў Нацыянальнай бібліятэцы і атрымалася эмацыянальным: перад гасцямі выступіў хор былых вязняў канцэнтрацыйных лагераў. За некалькі гадзін да гэтага ў часоўні шпіталя інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны прайшоў малебен.

Значнай падзеяй сёлетніх Калядных чытанняў стала падпісанне адноўленага Пагаднення аб супрацоўніцтве паміж Беларускай праваслаўнай царквой і Міністэрствам інфармацыі. На аснове пагаднення будзе распрацаваны комплексны план мерапрыемстваў, які дазволіць наладзіць супрацу паміж рэлігійнымі і свецкімі журналістамі.

«Традыцыйна ў год у нас праводзіцца некалькі семінараў з Беларускай праваслаўнай царквой, з тымі журналістамі, якія працуюць у гэтай тэматыцы. Мэта гэтых семінараў — у першую чаргу выпрацаваць стылістыку, каб людзі былі падрыхтаваныя. Зараз мы хочам актыўна ўключыць у працэс і факультэт журналістыкі БДУ», — паведаміў міністр інфармацыі Аляксандр Карлюкевіч падчас адкрыцця.

За два дні ладзілася работа шматлікіх секцый, прысвечаных актуальным сацыяльным пытанням, сярод якіх — праца з моладдзю, сямейныя каштоўнасці, сувязь царквы і культуры, развіццё і ўзмацненне духоўных і маральных каштоўнасцей у грамадстве.

**Дар'я СМІРНОВА**

стасункі

# Анталогія як падарунак

**Прэзентацыя двухтомнай анталогіі казахскай паэзіі і прозы, дзе прадстаўлены сучасныя паэты і празаікі Рэспублікі Казахстан, адбылася ў сталічнай бібліятэцы № 1 імя Л. Талстога.**

Анталогія тыражом 10 000 экзэмпляраў выдадзена на рускай мове Маскоўскім дзяржаўным універсітэтам. Сярод перастваральнікаў — найлепшыя паэты, празаікі і перакладчыкі Расіі.

У прэзентацыі бралі ўдзел Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Рэспублікі Казахстан у Рэспубліцы Беларусь Аскар Бейсенбаеў, дырэктар Цэнтралізаванай сістэмы публічных бібліятэк г. Мінска Алена Кубышкіна, старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхаіл Пазнякоў, прадстаўнікі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў і Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

У падарунак дзяржаўным бібліятэкам сталіцы перададзена больш чым дваццаць камплектаў выдання. Цяпер спецыялісты і чытачы могуць пазнаёміцца з найлепшымі дасягненнямі сучаснай казахскай літаратуры.

**Павел КУЗЬМІЧ**

імпрэзы

# Сустрэліся ў Пінску

**Па запрашэнні пінчан пісьменнікі Міхась Пазнякоў і Валянціна Паліканіна пабывалі ў сталіцы беларускага Палесся з творчымі выступленнямі.**

У СШ № 1 госці выступілі перад малодшымі школьнікамі. Да іх далучыўся пінскі кампазітар і спявак Віктар Мяцельскі. Яркай стала сустрэча са старшакласнікамі, якія горача апладзіравалі Міхасю Пазнякову, Валянціне Паліканінай, паэту з Брэста Міхаілу Куляшу і Віктару Мяцельскаму. Апошні выканаў некалькі песень на вершы мінчан. Дарэчы, кнігі з іх аўтографамі папоўнілі школьную бібліятэку.

Вечарам у Пінскім гарадскім Палацы культуры прайшла імпрэза Віктара Мяцельскага, які ўжо не першы год актыўна супрацоўнічае са сталічнымі паэтамі. Вяла вечарыну артыстка Мінскага гарадскога Тэатра паэзіі Святлана Яфрэмава. Гучалі творы гасцей, песні на вершы М. Пазнякова, В. Паліканінай, Н. Гальпяровіча, М. Шабовіча. Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення СПБ Міхась Пазнякоў уручыў Віктару Мяцельскаму і пінскаму паэту Валерыю Грышкаўцу найвышэйшую ўзнагароду сталічнага аддзялення — медаль «Максім Багдановіч».

Назаўтра імпрэза з удзелам Валянціны Паліканінай і Віктара Мяцельскага прайшла ў Пінскім дзяржаўным універсітэце.

**Павел КУЗЬМІЧ**

на развітанне

# Адлюстраванне эпох



**На 85-м годзе пайшоў з жыцця савецкі і беларускі пісьменнік, драматург і сцэнарыст Анатоль Андрэевіч Дзялендзік.**

Анатоль Дзялендзік нарадзіўся 4 сакавіка 1934 года (па першай — згарэлай — метрыцы ў 1933 годзе) у вёсцы Кулакі Салігорскага раёна. Быў разведчыкам у партызанскім атрадзе. Атрымаў медыцынскую адукацыю і 11 гадоў працаваў урачом псіхіятрычнай клінікі. Скончыў таксама Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. З 1968 па 1980 гг. працаваў на кінастудыі «Беларусьфільм». Член Саюза пісьменнікаў СССР з 1965 года. Быў Старшынёй секцыі драматургіі Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Друкаваўся з 1955 года, пішучы на беларускай і рускай мовах. Аўтар драм «Выклік багам», «Грэшная любоў», «Начное дзяжурства», «Апошнія суніцы ў жніўні», «Гаспадар» і інш. Напісаў таксама шэраг радыёп'ес («Шаўковыя травы», «Даўгавечнік», «Дыягназ» і інш.). У тэатрах паставілі 26 яго п'ес, а на «Беларусьфільме» экранізавалі 6 сцэнарыяў, найбольш вядомыя з якіх — «Ваўкі ў зоне» і «Анастасія Слуцкая». Апошні фільм атрымаў 17 прызоў на міжнародных кінафестывалях, у тым ліку ў ЗША і Кітаі. У Вялікім тэатры Беларусі зараз ідзе балет «Анастасія», лібрэта да якога напісаў Анатоль Дзялендзік. Узнагароджаны медалём Францыска Скарыны, атрымаў званне «Заслужаны дзеяч мастацтваў».

У эсэ пра А. Дзялендзіка пісьменнік, драматург і сцэнарыст Георгій Марчук заўважыў: «Прага творчасці перамагае песімізм, нават калі сілы падточвае хвароба і старасць, якіх не было відаць па яго спартыўнай фігуры, жыццялюбстве, актыўнай працы». Сапраўды, жаданне быць неабходным і радасць ад пісьменніцтва — тое, што сілкавала творцу на працягу многіх гадоў, няпростых і для яго, і для ўсяго грамадства. Літаратурная спадчына Анатоля Дзялендзіка застанецца люстэркам не для адной эпохі.

Саюз пісьменнікаў Беларусі і Мінскае гарадское аддзяленне СПБ глыбока смуткуюць з прычыны смерці пісьменніка Анатоля Андрэевіча ДЗЯЛЕНДЗІКА і выказваюць шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

ЛіМ КАЛЯНДАР

**7 снежня** 70-гадовы юбілей святкуе Віктар Супрунчук, празаік.

**8 снежня** — 90 гадоў з дня нараджэння Юрыя Труханава (1929—1999), заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь.

**10 снежня** — 445 гадоў з дня нараджэння Мікалая Лянчыцкага (1574—1653), дзеяча беларускай культуры першай паловы XVII ст.

**10 снежня** — 95 гадоў з дня нараджэння Ангеліны Бельцюковай (1924—2011), майстра дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва.

**10 снежня** — 80 гадоў з дня нараджэння Анатоля Белага (1939—2011), грамадска-культурнага дзеяча, мастацтвазнаўцы, калекцыянера, пісьменніка.

**12 снежня** — 205 гадоў з дня нараджэння Адама Завадскага (1814—1875), друкара, выдаўца.

**12 снежня** — 95 гадоў з дня нараджэння Нічыпара Пашкевіча (1924—2003), літаратуразнаўцы, заслужанага работніка культуры Рэспублікі Беларусь.

**12 снежня** — 80 гадоў з дня нараджэння Ірыны Шаблоўскай (1939—2004), літаратуразнаўцы.

**13 снежня** — 100 гадоў з дня нараджэння Валяр'яны Жолтак (1919—2000), мастака.

**13 снежня** 75 гадоў спаўняецца Вітаўтасу Жэймантасу, публіцысту.

люстэрка тыдня

«Блакадная кніга» Алеся Адамовіча і Данііла Граніна — літаратурны подзвіг. Такое меркаванне выказаў Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі Дзмітрый Мезенцаў на канферэнцыі, прысвечанай 100-годдзю Данііла Граніна і 40-годдзю выхаду «Блакаднай кнігі», у Доме Масквы ў Мінску. «Два вялікія літаратары і грамадзяніны ўзялі на сябе абавязак прадставіць гісторыю блакады максімальна сумленна і праўдзіва», — падкрэсліў пасол. Кніга атрымлівае асаблівае гучанне цяпер. «Гэта наказ не дапускаць перапісвання гісторыі, пераасэнсавання ролі салдата Вялікай Айчыннай, які вызваліў Еўропу і свет ад фашызму, і аддаць даніну павагі і ўдзячнасці Алесю Адамовічу і Даніілу Граніну. Сёння назаву яшчэ адно імя — прафесара, доктара гістарычных навук Валянціна Кавальчука, які пераканаў у свой час кіраўніцтва Ленінграда назваць сапраўдныя лічбы вялікіх страт, якія панёс блакадны горад», — распавёў Дзмітрый Мезенцаў.

Кабінет беларускай мовы і культуры імя Янкі Купалы адкрылі ў Падрыхтоўчым цэнтры БДУ ў кітайскім горадзе Санья, паведамілі ў прэс-службе беларускай ВНУ. Ён стане культурна-адукацыйным цэнтрам папулярызацыі беларускай гісторыі, літаратуры, нацыянальных традыцый, асаблівасцей, славутасцей сярод кітайскіх грамадзян. Слухачы атрымаюць магчымасць лепш пазнаць самабытнасць, жыццёвы ўклад і нацыянальны каларыт беларусаў, папрацаваць з арыгінальнымі матэрыяламі па лінгвістыцы, гісторыі, мастацтве і краіназнаўстве Беларусі. Плануецца, што тут будуць арганізоўвацца адукацыйна-культурныя мерапрыемствы профільнай тэматыкі. Урачыстая цырымонія адкрыцця прайшла пры ўдзеле дэлегацыі БДУ на чале з рэктарам Андрэем Каралём, а таксама дырэктара Падрыхтоўчага цэнтра БДУ Чжан Лэя, слухачоў і выкладчыкаў.

Выстаўка-конкурс артэфактаў з фондаў Дамоў рамёстваў Віцебскай вобласці «Рэліквія» знаёміць з этнаграфічнай спадчынай рэгіёна, паведамілі ў Віцебскім абласным метадычным цэнтры народнай творчасці. У экспазіцыю ўвайшлі найбольш цікавыя і аўтэнтычныя прадметы побыту і традыцыйных народных рамёстваў. Сярод іх — народны жывапіс і абразы, маляванкі, лубачныя гравюры на дрэве, размалёўка на шкле, лакавая мініяцюра, пісанкі, драўляная скульптура, куфэркі, мастацкая апрацоўка бяросты, бондарства і шмат іншага. «Усё гэтае багацце прызначана прадэманстраваць нашу багатую традыцыйную народную культуру, абудзіць цікавасць майстроў і насельніцтва да яе больш глыбокага вывучэння і захавання ўнікальных помнікаў побыту», — адзначылі ў цэнтры. Азнаёміцца з выстаўкай можна да 16 снежня.

Навукоўцы выкарысталі штучны інтэлект, каб вызначыць, які аб'ём п'есы «Генрых VIII» Уільям Шэкспір напісаў сам, а які — Джон Флэтчэр, паведамляе РІА «Новости». Эксперты даўно зразумелі, што гэты твор — плён калектыўнай працы. Але не ведалі, якую частку напісаў сам Шэкспір, а якую — суаўтар, які змяніў яго на пасадзе драматурга акцёрскай трупы «Людзі караля» ў 1616 годзе. Чэшскі спецыяліст па штучным інтэлекце Пётр Плехач вырашыў звярнуцца да дапамогі алгарытму, які вывучае стыль пісьменніка і можа вызначыць яго руку. У выніку атрымалася высветліць, што Флэтчэр стварыў некалькі сцэн, у тым ліку значную частку другога дзеяння. У некаторых эпізодах п'есы алгарытм выказаўся за змяшанае аўтарства. Падабенства паміж творамі Шэкспіра і Флэтчэра заўважыў яшчэ ў 1850 годзе літаратуразнавец Джэймс Спэддзінг. Вынікі аналізу «Генрыха VIII» пры дапамозе штучнага інтэлекту шмат у чым пацвердзілі яго здагадкі.

**Агляд цікавінак ад Іны ЛАЗАРАВАЙ**

# Унікальная спадчына

Два месяцы таму ў музей Якуба Коласа прыйшоў працаваць новы дырэктар Аляксандр Храмы, які адказна ставіцца да задач захавання і папаўнення спадчыны песняра. На яго думку, ужо зараз спадчыну трэба не проста захоўваць на паліцах, а выносіць у народ, каб людзі ведалі і памяталі, хто такі Якуб Колас.

— Сёння я дакладна разумею, што канцэпцыю мадэлі развіцця трэба разглядаць не толькі для асноўнага будынка нашага музея, але таксама і за яго межамі, — упэўнены Аляксандр Храмы. — Я не забываюся, што ў Мінску ёсць тая ж плошча Якуба Коласа, якую таксама лічу адной з частак нашай установы, ёсць магіла песняра, ёсць філіял — Мікалаеўшчына на Стаўбцоўшчыне, дзе знаходзіцца сядзіба Якуба Коласа. Там прайшоў адзін з яго перыядаў жыцця. Нельга забыць пра Пухавіцкі раён, дзе ў 1930-я гады пясняр часта бываў, Акадэмію навук, дзе адбывалася яго навуковая дзейнасць, 20 бібліятэк і тэатр, якія носяць імя Якуба Коласа. Спадчына паэта вялікая. Штогод у нашым музеі праходзяць Каласавіны. Праўда, заўсёды яны працавалі толькі ў літаратурным напрамку, але з наступнага года, я спадзяюся, мы іх пашырым. Мне, як новаму дырэктару, цяжка пакуль нават асэнсаваць увесь той багаж, які трэба адначасова падтрымліваць і працаваць.

4 снежня ў музеі адбылося ўрачыстае мерапрыемства, дзе ў гонар Якуба Коласа прагучала безліч прыемных і цёплых слоў. У межах свята адкрылася выстаўка «Ад Адама да Кастуся Міцкевіча. Песняры зямлі беларускай». Праз такую назву арганізатары ў першую чаргу хацелі пашырыць уяўленне наведвальнікаў і ўвогуле жыхароў Беларусі пра жыццё паэта. На жаль, не ўсе сёння ведаюць, што сапраўднае прозвішча Коласа — Міцкевіч.

— Мы хацелі паказаць, што Якуб Колас выхоўваўся на ідэалах сусветна вядомых песняроў: не толькі такіх, як Пушкін альбо Лермантаў, але і Адам Міцкевіч, — расказаў Аляксандр Храмы. — Адчуваецца тоеснасць у творчасці абодвух паэтаў. Нягледзячы нават на тое, што яны пісалі на розных мовах. Пры жыцці Якуб Колас падтрымліваў стасункі з польскім бокам, каб паказаць, што Адам Міцкевіч — яшчэ і беларускі пісьменнік. Выстаўку арганізавалі пры падтрымцы калекцыянера Уладзіміра Ліхадзедава. Шмат што паказана ўпершыню. Маюцца фотаздымкі, якія да гэтага часу нідзе не публікаваліся.

Фота Кастуся Дробава

*Асабістыя рэчы Данілы Міцкевіча, першага дырэктара музея Якуба Коласа.*

Дарэчы, у музея ёсць яшчэ адна нагода для святкавання — 105-годдзе першага дырэктара — старэйшага сына Якуба Коласа Данілы Канстанцінавіча. З гэтай прычыны створана асобная экспазіцыя.

Сёння ў архіве музея знаходзіцца фільм «Народны пясняр», зняты Юрыем Тарычам. Гэтая стужка мала вядома шырокаму колу аматараў кінематаграфіі, тым не менш, яна прыцягвае з першых хвілін прагляду. Калісьці сам Тарыч падарыў фільм Якубу Коласу. Стужка таксама стала падарункам для гасцей музея.

— Увогуле, калі я прыйшоў у музей, быў вельмі ўражаны, наколькі актыўна працуюць музейныя работнікі, — успамінае Аляксандр Васільевіч. — Мне адразу дапамаглі зразумець, у якім напрамку мы павінны рухацца і як вызначацца са стратэгіямі. Гэта неацэнная дапамога. У мяне добрыя адносіны з нашчадкамі Якуба Коласа, якія таксама стараюцца нас падтрымаць. Сённяшняе свята — працэс калектыўны, за які кожнаму, хто быў датычны, хочацца падзякаваць.

Музей Якуба Коласа захоўвае больш за 2,5 тысячы рукапісаў. Сярод самых цікавых і каштоўных — цыкл дарэвалюцыйных вершаў Коласа, яго белетрыстыка, фальклорныя сшыткі з запісамі казак, легенд, паданняў, народных песень, якія паэт зрабіў у перыяд вучобы ў Нясвіжскай настаўніцкай семінарыі і ў гады працы настаўнікам на Палессі ў 1899—1904 гадах. Сярод найбольш каштоўных экспанатаў кніжнага фонду — першыя і амаль усе прыжыццёвыя выданні твораў Якуба Коласа на беларускай і рускай мовах, а таксама адзінае, якое захавалася з усяго накладу, 4-е выданне паэмы «Новая зямля» 1941 года.

*Якуб Колас у 1950-я гады.*

— Мне вельмі важна ведаць, што 4-е выданне «Новай зямлі» захоўваецца ў нас. Якуб Колас заўсёды для мяне быў блізкім паэтам. Мама з дзяцінства чытала мне ўрыўкі з «Новай зямлі», — падзяліўся дырэктар музея. — Цяпер я чытаю іх сам. Калі, бывае, становіцца сумна, пачытаеш — і адразу адчуваеш сябе лепш. Яго радкі нагадваюць пра шчаслівыя часы дзяцінства.

Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа актыўна папулярызуе веды пра ўклад пісьменніка ў развіццё Беларусі як краіны і беларускага народа як самабытнай нацыі. Статус адзінага мемарыяльнага музея-сядзібы ў Мінску, безумоўна, вызначае яго ўнікальнасць сярод іншых літаратурных музеяў сталіцы.

**Вікторыя АСКЕРА**

**Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.**

# Падарунак Коласа аўтару «Ціхага Дона»

Жыццю і творчасці Якуба Коласа прысвечана вялікая колькасць артыкулаў і паведамленняў, навуковых прац і дысертацый, канферэнцый і круглых сталоў. Вельмі радуе, што пры падтрымцы Міністэрства інфармацыі Інстытутам мовы і літаратуры НАН Беларусі быў выдадзены Збор твораў Якуба Коласа ў 20 тамах. Здаецца, што ў гэтым фундаментальным выданні ўлічаны ўсе матэрыялы, звязаныя з творчай дзейнасцю паэта. Але кожны год з'яўляюцца новыя знаходкі і адкрыцці.

Гартаючы старонкі эпісталярнай спадчыны беларускага песняра, я звярнула ўвагу на ліст паэта да сябра і перакладчыка Яўгена Сямёнавіча Мазалькова ад 11 студзеня 1955 года. Якуб Колас пісаў: «Как расцениваете Вы выступление Шолохова на 2-м Всесоюзном съезде писателей? Я послал ему письмо и целиком, за некоторым исключением, поддержал его».

Сваю прамову на Другім Усесаюзным з'ездзе пісьменнікаў, які адбыўся ў Маскве ў 1954 годзе, М. Шолахаў прысвяціў пытанням павышэння пісьменніцкага майстэрства. Асноўная прычына сур'ёзных недахопаў у літаратуры, — па меркаванні Шолахава, — крыецца ў паслабленні патрабавальнасці пісьменнікаў у адносінах да сваёй працы, у адарванасці іх ад рэальнага жыцця, а таксама ў паніжэнні ацэначных крытэрыяў з боку крытыкаў. Яго непакоіць «серый поток бесцветной, посредственной литературы, который в последние годы хлещет со страниц журналов и наводняет книжный рынок». Недахопы ў літаратуры Шолахаў звязвае не з дзейнасцю маладых пісьменнікаў, творчы рост якіх можна прасачыць ад кнігі да кнігі, а з творчасцю ўжо вядомых карыфеяў, якія, «потеряв уважение к своему труду и к читателю, увядают на корню и в конце концов превращаются из мастеров в ремесленников». Ён гаворыць аб тым, што падчас вайны, калі мастацкае слова служыла арміі і народу, у пісьменнікаў не было часу думаць аб «создании крупных произведений, выношенных в тяжелых и долгих раздумьях, отточенных по языку, безупречных по стилю». Многія пісьменнікі ў пасляваенны час працягваюць пісаць па інерцыі, «наспех, неряшливо, небрежно, и это обстоятельство не замедлило резко сказаться на художественном уровне значительного числа произведений». Такія няўдалыя творы Шолахаў называе «литературными выкидышами». У сваім выступленні ён гаворыць аб Коласе як аб адным з самых таленавітых пісьменнікаў сучаснасці, ставіць яго ў адзін шэраг з Фадзеевым, Паўстоўскім, Упітам, Твардоўскім.

Разглядаючы крытычную ацэнку твораў, Шолахаў задае наступнае пытанне: «Была ли напечатана в нашей печати хоть одна критическая статья, в полную меру, без всяких скидок, оговорок и оглядок воздающая должное какому-либо литературному мэтру за его неудачное произведение?» І сам жа на яго адказвае, што, на жаль, такога артыкула не было. З-за гэтага выступлення на Шолахава накінуліся з рэзкай крытыкай. А Колас даслаў яму ліст у падтрымку, бо і сам падзяляў некаторыя ідэі, выказаныя рускім пісьменнікам на з'ездзе.



Якуб Колас

НА РОСТАНЯХ

трылогія

Том I

Кнігі першая і другая

Сердечно любимому, горячо уважаемому писателю советской земли Михаилу Александровичу Шолохову Якуб Колас 24/VIII 1955 г.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БССР

Рэдакцыя мастацкай літаратуры

Мінск 1955

Выступленне Міхаіла Шолахава пераклікаецца з артыкулам Коласа «Адарванасць ад жыцця», які ўпершыню быў надрукаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва» ў 1938 годзе. Якуб Колас пісаў: «У практыцы пісьменніцкай работы ёсць прыклады, на якія варта звярнуць нам увагу. Усім вядомы высокамастацкія творы пісьменніка Шолахава і яго метады работы. Ці не варта было б узяць і нам з яго прыклад? Асноўнае, што стаўлю я ў загану нашым пісьменнікам, гэта — іх адарванасць ад жыцця». Пра сябе Колас піша: «Мая адміністратарская работа страшэнна замінае маёй непасрэднай пісьменніцкай рабоце. Я шмат гадоў адчуваю патрэбу па-сапраўднаму ўзяцца за сваю работу, асвяжыць запас назіранняў над жыццём, над моваю, у якой мы творым, глыбей вывучыць аб'екты сваёй творчасці». Прыкладна аб тым жа перажываў Якуб Колас, калі пісаў свой апошні ліст да Я. С. Мазалькова ад 13 жніўня 1956 года: «Вы должны расценивать меня не как поэта, писателя, а как работника канцелярии в её различных отраслях. Это меня возносит, и снижает. Ведь я поэт на 50%. А где остальные 50%, Вы, думаю, знаете». Паэт меў на ўвазе сваю грамадскую дзейнасць (дэпутацкую, членства ў розных камісіях і ўдзел у шматлікіх пасяджэннях), дзейнасць на пасадзе віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, што адымала многа часу ад яго творчасці.

З мэтай адшукаць ліст, які Колас даслаў Шолахаву, я звярнулася ў Дзяржаўны музей-запаведнік М. А. Шолахава ў Растове-на-Доне, які з'яўляецца асноўным інстытутам па захаванні матэрыялаў, звязаных з жыццём і творчасцю рускага пісьменніка. Ліст не быў знойдзены ў фондах музея, можа, ён не захаваўся ці чакае свайго часу, каб быць знойдзеным у іншых музеях ці архівах. Затое быў выяўлены цікавы дарчы надпіс Якуба Коласа на кнізе «На ростанях», дагэтуль невядомы коласазнаўцам: «Сердечно любимому, горячо уважаемому писателю советской земли Михаилу Александровичу Шолохову. Якуб Колас. 24.VIII.1955 г.». Кніга захоўваецца ў асабістай бібліятэцы Шолахава. У поўным зборы твораў Якуба Коласа прыведзены 8 дарчых надпісаў пісьменніка на розных асобніках кнігі «На ростанях». Гэта і апошняя кніга, якую паэт дарыў сваім сябрам і знаёмым, пакідаючы дарчыя надпісы. Сярод шчаслівых яе ўладальнікаў — сябры сям'і Якуба Коласа Гаўрыла і Ларыса Гарэцкія, сябар Коласа і перакладчык Я. С. Мазалькоў, беларускі пісьменнік і асабісты сакратар Якуба Коласа М. Лужанін, дырэктар Белдзяржвыдавецтва З. П. Матузаў, знаёмыя паэта Аляксандра Кетлер і Соня Ваўчок, таварыш па камеры царскай турмы, прататып аднаго з герояў трылогіі Аляксандр Голуб. Адну з кніг Якуб Колас падараваў музею Беларускага Палесся ў Пінску. Выяўлены асобнік з дарчым надпісам Шолахаву стаў дзявятым у гэтым шэрагу кніг.

Такія адкрыцці асабліва значныя, бо наступны год юбілейны для трылогіі «На ростанях», якая займае выключнае месца ў творчасці пісьменніка. Трылогія напісана на падставе шырокага аўтабіяграфічнага матэрыялу, над яе тэкстам Якуб Колас працаваў літаральна ўсё сваё творчае жыццё. Пачатак напісання першай часткі трылогіі адносяць да 1921—1922 гадоў, а асобнай кнігай увесь твор выйшаў толькі ў 1955 годзе. Радуе, што да 65-годдзя трылогіі ў выдавецтве «Мастацкая літаратура» ў новай серыі «Напісанае застаецца» ўжо з'явілася новае выданне трылогіі.

Гэты год таксама багаты на юбілейныя даты. 4 снежня Дзяржаўнаму літаратурна-мемарыяльнаму музею Якуба Коласа спаўняецца 60 гадоў. Сям'я Якуба Коласа віншуе супрацоўнікаў музея з надыходзячым юбілеем, жадае плённай працы, новых цікавых праектаў і знаходак, аб якіх абавязкова раскажам на старонках «Літаратуры і мастацтва».

**Васіліна МІЦКЕВІЧ,**
**праўнучка Якуба Коласа**

# Згадкі ў чаўне зары

Калі прыгадваю Міхася Лынькова, міжвольна ўспамінаецца верш Максіма Танка «На рыбалцы», прысвечаны яму:

*— Міхась!..*
*Зачынена акно.*
*Няўжо ён яшчэ спіць?*
*Хаця ў чаўне зары*
*На бераг наш*
*Ужо вяслуе ранак.*

*— Мі-хась!..*
*Няўжо забыўся ён,*
*Што сёння меліся*
*Рыбацкае мы шчасце*
*Паспытаць?*
*З героямі*
*Сваіх апавяданняў*
*Пад дзень яго ахмарыў сон?*

*А можа,*
*Размінуліся мы з ім,*
*І ён раней адплыў*
*На гатаўскія тоні?*
*Яшчэ аклікну раз*
*І паплыву шукаць.*

Пісаўся гэты твор ў 1975 годзе, пасля таго, як 21 верасня Міхася Ціханавіча не стала. Яны — народны пісьменнік і народны паэт, нягледзячы на розніцу ва ўзросце (Міхась Ціханавіч нарадзіўся ў 1899 годзе, а Максім Танк — 1912-м), сябравалі. Асабліва цесныя стасункі ў іх былі на Нарачы, дзе абодва мелі лецішчы.

У гэтым я ўпэўніўся пасля заканчэння 10 класа (тагачасная Крывасёлкаўская сярэдняя школа Капыльскага раёна якраз стала адзінаццацігодкай). Дырэкцыя ў летнія канікулы рэгулярна арганізоўвала для найлепшых вучняў экскурсійныя паездкі. Гэтым разам мы паехалі ў Мінск, а пасля — на возера Нарач. Там упершыню і ўбачылі жывых пісьменнікаў. Апавяданне М. Лынькова «Гой» ужо ведалі, бо яно было ў школьнай праграме па літаратуры.

Глядзелі на Міхася Ціханавіча, і адразу ў памяці ажывала прачытанае:

«І плакала Рыва…

Плакала ціха, непрыкметна, тымі прыдушанымі слязьмі, якія цяжка стрымаць, цяжка высушыць, бо ідуць яны ад самай глыбіні сэрца…

Плакала Рыва… Яна палюбіла гоя».

Не толькі гэтае, а і «Над Бугам», «Андрэй Лятун», «Васількі», «Астап», «Сустрэчы» — як бы візітоўкі М. Лынькова-апавядальніка. Так хочацца хутчэй узяць у рукі кнігу Міхася Ціханавіча, каб перачытаць іх. Хоць бы «Над Бугам»:

«Хто не любіць адпачынку на зялёных лугах, асабліва, калі пякуць мазалі пераходу і пацягвае жывот ціхім сумам аб кашы з салам, аб шклянцы чаю з пахкім хлебам салдацкім? Адпачынак быў, але не было кашы, не было сала, і толькі чай булькаў у кацялках. На бульбатках скакала сонца, а навокал лугі расцвіталі кураслепам і незабудкамі і дзесьці там, каля вёскі, кудахталі куры».

А перагарнуўшы старонкі лёсу Ванькі Разанскага і Ваські Шкетава, уздыхнуць над яго апошнімі, незразумелымі для некаторых, словамі:

— Эх, позна, позна, і так рана, рана...

Такое ў памяці ніколі не дакучае і ніколі не згасае. Як і шмат хто з пісьменнікаў, дэбютаваў М. Лынькоў як паэт, у 1919 годзе ў смаленскай газеце «Борьба». Сама публікацыя даследчыкамі не выяўлена, вядомы толькі факт яго першага выступлення ў друку.

У бабруйскай акруговай газеце «Камуніст» у 1925 годзе былі змешчаны яго вершы. Пісаў М. Лынькоў таксама карэспандэнцыі, нататкі і, як сам пазначаў іх жанр, «маленькія фельетоны». Зразумеў, што паэзія не «для яго», таму і перайшоў на прозу.

У газеце «Камуніст» ён працаваў з вясны 1925 года. Спачатку — адказным сакратаром, а пасля — і рэдактарам. Перад гэтым прайшоў немалую жыццёвую школу. Скончыў народнае вучылішча, Рагачоўскую настаўніцкую семінарыю. Настаўнічаў у Ліпніцкай земскай школе (цяпер Буда-Кашалёўскі раён). У грамадзянскую вайну служыў у войску, удзельнічаў у барацьбе з атрадамі Булак-Булаховіча. Пасля дэмабілізацыі зноў настаўнічаў. Стаўшы журналістам, не толькі пісаў, але і гуртаваў вакол сябе маладыя таленты. Васіль Вітка, Сяргей Грахоўскі, Аляксей Зарыцкі, Мікола Лобан, Барыс Мікуліч — толькі некаторыя з пісьменнікаў, якія дзякуючы яму паверылі ў свае сілы. Быў таксама арганізатарам і кіраўніком Бабруйскай філіі «Маладняка».

Фота прадастаўлена Беларускім дзяржаўным архівам-музеем літаратуры і мастацтва.

*Максім Танк і Міхась Лынькоў з унучкай. Нарач. 1960-я гады.*

Як празаік, дэбютаваў апавяданнем «З перажытых год». Потым быў «Гой» — сапраўднае адкрыццё ў літаратуры. Не засталіся незаўважанымі і ягоныя першыя кнігі «малога жанру»: «Апавяданні» (1927), «Гой» (1929), «Андрэй Лятун» (1930). Пераехаўшы ў 1930 годзе ў Мінск, працаваў у Дзяржаўным выдавецтве БССР. З 1934-га па 1941 год рэдагаваў часопіс «Полымя рэвалюцыі». Адначасова з 1938-га быў старшынёй Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Напісаў М. Лынькоў і тры аповесці для дзяцей: «Янка-парашутыст», «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў» і «Міколка-паравоз». Усе надзіва займальныя, не пазбаўленыя прыгодніцкіх элементаў. Асабліва вылучаецца апошняя, якая шмат дзесяцігоддзяў перавыдаецца. Ёсць і мастацкі фільм «Міколка-паравоз». У гэтым творы — аўтабіяграфічныя моманты: маленства аўтара таксама было звязана з чыгункай.

У войска пісьменніка прызвалі, калі пачаўся вызваленчы паход Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь. Рэдагаваў газету «Беларуская звязда», што з'яўлялася органам палітупраўлення Беларускага фронту. Пад уражаннем тых падзей напісаў восем апавяданняў, што склалі кнігу «Сустрэчы» (1940). Зборнік жа «Астап» (1944) — гэта ўжо рэаліі Вялікай Айчыннай вайны. У тыя гады рэдагаваў газету «За Савецкую Беларусь», працаваў у розных жанрах. Фельетоны, нарысы, апавяданні змяшчаў не толькі ў гэтым выданні, але і на старонках «Правды», «Известий», часопісаў «Огонек», «Славяне», у калектыўных зборніках і альманахах.

У яго быў і асабісты рахунак з фашыстамі: у верасні 1941 года гітлераўцы забілі жонку і сына. У 1946 годзе Янка Маўр напісаў пра гэта апавяданне «Завошта?». Асабістая драма Міхася Ціханавіча не зламала, па-ранейшаму заставаўся жыццярадасным і бадзёрым, верыў у Перамогу, жыў ёю, набліжаў сваімі творамі — аптымістычнымі па гучанні, гераічна-патрыятычнымі па зместу.

Яшчэ ў 1942 годзе пачаў збіраць матэрыял для напісання рамана «Векапомныя дні». Разумеючы, наколькі карпатлівая чакаецца праца, перш чым узяцца за пяро, старанна абдумваў сюжэтныя хады. Быў упэўнены, што для здзяйснення такой маштабнай задумы патрабуецца час і нічога па-мастацку дасканалага хутка не напішацца. Урывак з першага раздзела быў змешчаны ў газеце «Звязда» толькі 29 лістапада 1944 года. З далейшай публікацыяй не спяшаўся. Якраз у гэты час і праявілася яго асаблівая патрабавальнасць да сябе, сказалася пісьменніцкая і чалавечая сумленнасць.

Пісалася марудна і цяжка, многае даводзілася перапрацоўваць, ствараць нанава, а штосьці і скарачаць. Гэта ўсё больш адчувалася, чым глыбей пранікаў у задуму. Але ўсё рабіў цярпліва, не спяшаючыся, прадчуваючы, што гэты твор, бадай, стане галоўным у яго творчасці. Чатыры рэдакцыі… Дапрацоўваючы і перапрацоўваючы раман, скараціў каля 400 старонак тэксту. Па сутнасці, адмовіўся ад аб'ёмнай кнігі. Далёка не кожны адважыцца на такое. Часам жа па розных прычынах даводзілася рэзаць па жывым. Нямала значыла і пажаданне Якуба Коласа. Канстанцін Міхайлавіч, паспеўшы пазнаёміцца з першай кнігай, паставіўся да напісанага ўважліва і заклапочана. Параіў працягваць працаваць над раманам, каб ён сапраўды стаў «векапомным творам».

Наконт сцвярджэння, што «Векапомныя дні» — эпапея, сам Міхась Ціханавіч спачатку так вызначыў жанр свайго маштабнага твора. Аднак да апошняй апублікаванай рэдакцыі ставіўся ўжо крыху іранічна, называючы свой раман «апупеяй». Маўляў, такая доўгая праца можа давесці да — таксама яго слова — «апупення». Але няма сумнення ў тым, што «Векапомныя дні» належаць да найлепшых дасягненняў беларускай літаратуры, прысвечанай Вялікай Айчыннай вайне. У 1968 годзе раман быў заслужана адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР імя Якуба Коласа.

Безумоўна ваенная проза сягнула далёка наперад. Несумненна, многае змянілася ў ацэнцы гераічна-велічных падзей. Відавочна і тое, што прыйшоў час такой праўды, якая доўга замоўчвалася. Бясспрэчна, аднак, і іншае. «Векапомныя дні» М. Лынькова, вобразна кажучы, рыхтавалі, расчышчалі дзялянку тым, каму ўтвораная ляда дазволіць разгарнуцца як след, каб ужо самім шчыраваць больш плённа і ўпэўнена.

Міхась Ціханавіч быў рэдкім жыццялюбам і аптымістам. Гібеллю першай жонкі выпрабаванні для яго не скончыліся. Новая бяда напаткала ў 1948 годзе. Другая жонка Соф'я Захараўна, з якой пражыў тры гады, трапіла ў цяжкую аўтамабільную катастрофу. Гэта стала для яго моцным ударам. Нават з'явіліся думкі аб самагубстве. Але своечасова адумаўся. Разумеў, што ёй неабходна не толькі дапамога ўрачоў, а і маральная падтрымка. Усё разам узятае і паспрыяла таму, што каханая жанчына, не зважаючы на далёка нярадасныя прагнозы, стала на ногі.

Гэта акрыліла, надало яшчэ большага імпэту ў працы. Бачачы, якой папулярнасцю карыстаюцца яго аповесці для дзяцей, хацеў напісаць для іх яшчэ які-небудзь твор. Быў упэўнены, што «ў дзецях галоўнае шчасце людзей», таму хацелася прыносіць і самім ім больш яго. Не ў апошнюю чаргу і дзякуючы цікавым кнігам. Балазе ў самога гадаваліся дачка і сын. Юрыдычна яны лічыліся прыёмнымі, а ў сапраўднасці... Не кожны бацька здатны даць столькі цяпла і шчодрасці, колькі дарыў ім Міхась Ціханавіч.

Шкада толькі, што новых дзіцячых твораў так і не напісаў. Адзін жа з іх, бадай, мог з'явіцца з матэрыялаў, узятых з яго даваеннага рамана «На чырвоных лядах». Ускосна меркаваць пра гэта дае падставу ягоны ліст вядомаму крытыку і перакладчыку Яўгену Мазалькову: «Што датычыць "Чырвоных лядаў", дык я нават ніколі не дапусціў іх да перавыдання, паколькі яны зусім мяне не задавальняюць. Я іх пакідаў як чарнавы матэрыял для адной задуманай працы». Хоць нельга не адмаўляць і задумы яшчэ аднаго «дарослага твора». Прынамсі, адштурхоўваючыся ад разваг Дзмітрыя Бугаёва, які прысвяціў М. Лынькову кнігу «Шчодрае сэрца пісьменніка», пасля зірнуў на яго творчасць з абсягаў сённяшняга дня: «[…] "Чырвоныя ляды" не толькі не з'яўляюцца безумоўнай няўдачай пісьменніка, як гэта шмат разоў сцвярджалася, а, наадварот, належаць да найбольш істотных і па-свойму цікавых набыткаў нашай прозы 30-х гадоў».

Гаворачы пра чалавечнасць Міхася Ціханавіча, да месца сказаць пра тое, як любіў ён творчую моладзь не толькі ў гады свайго юнацтва, а і тады, калі сам многага дасягнуў. Яго любімае «Дзярзайце, юнашы!» — гэта і заклік, і адабрэнне, і непрыхаваная радасць, што ёсць прадаўжальнікі, падрастаюць тыя, на каго можна спадзявацца. У 30-я ж гады, калі набіраў знішчальныя абароты махавік рэпрэсій, рызыкуючы, дапамагаў жонкам «ворагаў народа». Загадваючы адным з аддзелаў у Дзяржаўным выдавецтве БССР, асобным з іх даваў якія-небудзь заказы, каб яны і іх сем'і не памерлі з голаду.

Небяспека аднойчы навісла і над самім пісьменнікам. Не ў 30-я, а ў Вялікую Айчынную вайну. У рэдакцыі газеты «За Савецкую Беларусь» працаваў і адзін пасля знакаміты паэт. Як быццам, з яго падачы Міхася Ціханавіча абвінавацілі ў несвоечасовай дастаўцы гэтага выдання на фронт. Для ваеннага часу — страшнае абвінавачванне. На шчасце, усё абышлося. Але М. Лынькоў не забыўся аб беспадстаўных абвінавачваннях, крыўду пранёс праз усё жыццё.

Гэта стала вядома пасля яго смерці 21 верасня 1975 года. У савецкія часы, як вядома, пад некралогамі знакамітых людзей падпісваліся першыя асобы рэспублікі. Калі ж паміралі вядомыя літаратары, то — і члены прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР. Тут і высветлілася, што Міхась Ціханавіч быў катэгарычна супраць таго, каб згадвалася прозвішча паэта, які яго ўсё ж такі падставіў. Сакратару ЦК КПБ А. Кузьміну давялося ўпрошваць Соф'ю Захараўну, каб яна ўсё ж дала дазвол на гэта. Ці не дзве гадзіны Аляксандр Трыфанавіч угаворваў яе.

Сцвярджаю гэта са слоў фотакарэспандэнта «ЛіМа» Уладзіміра Крука, з якім у мяне былі самыя прыязныя адносіны. Не верыць Уладзіміру Андрэевічу няма ніякіх падстаў. А прозвішча паэта не называю, бо не нам быць суддзямі ў гэтай гісторыі. Дый па іншай яшчэ прычыне. Хапае і так ахвочых ставіць крыж ці не на ўсёй савецкай літаратуры. Беларускай савецкай — не ў апошнюю чаргу. Ёсць і жадаючыя адмаўляць і напісанае М. Лыньковым.

А мо ўсё ж лепей прачытаць які-небудзь твор? Разумею, што на «Векапомныя дні» часу не стае. Але ж, каб пераканацца, якім вялікім талентам валодаў Міхась Ціханавіч, дастаткова і яго найлепшых апавяданняў. Для юных жа чытачоў — найперш «Міколкі-паравоза».

**Алесь МАРЦІНОВІЧ**

# ПРАТАТЫПЫ І АРХЕТЫПЫ

*«І гэтае перапляценне часоў, якія збліжаюцца, разгаліноўваюцца, абрываюцца альбо не судакранаюцца ў нашых жыццях, ахоплівае ўсе магчымыя варыянты».*

Х. Л. Борхес «Сад, дзе разыходзяцца сцяжынкі».

Мода на тоўстыя шматстаронкавыя раманы вяртаецца — насуперак прагнозам культуролагаў наконт нібыта «кліпавасці» мыслення сучаснага чытача, яго няздольнасці ўспрымаць вялікія шматузроўневыя тэксты.

Таму да кожнага новага твора такога кшталту падступаеш адначасова з насцярогай і надзеяй: а раптам?

Кірыл Стаселька, вядомы чытачу сваімі кнігамі «Дзіцячы маніфест» і «*Marginalis*», сёлета выдаў новы раман пад інтрыгоўнай назвай «Дзевяць жыццяў Віта Морэ» (Мінск, «Галіяфы»). Шматабяцальная анатацыя запэўнівае чытача, што ён паглыбіцца «ў шэраг гістарычных перыядаў і падзей, кантынентаў і краін», а Віта Морэ — гэта «…не проста галоўны герой, канкрэтная асоба, але вобраз, прататып, які, з аднаго боку, яднае нас, а з іншага — выяўляе нашу рознасць і ўнікальнасць, нашы памкненні, страхі, чаканні і матывы».

Аднак падчас чытання кнігі прыходзіць разуменне, што «раман» — не зусім дакладнае вызначэнне дадзенага твора. Перад намі хутчэй некалькі аповесцяў, звязаных адным персанажам. Прычым асобныя часткі пазла ніяк не складваюцца ў выразны малюнак. Хаця, трэба аддаць належнае, храналагічна тут усё вытрымана паслядоўна, прынамсі, перад намі паўстаюць спачатку дзяцінства, затым юнацтва, сталасць, і ўрэшце старэчая нямогласць галоўнага героя. Але ж сувязь паміж раздзеламі даволі штучная, нацягнутая. Кожная з сямі пададзеных гісторый — асобны закальцаваны сусвет, унікальны расповед, які адрозніваецца ад іншых не толькі часам і геаграфіяй дзеяння, але жанрава і стылёва. Ці не «Хмарным атласам» Дэвіда Мітчэла натхняўся Кірыл Стаселька? Тут і чарадзейная казка, і філасофская прытча, і дэтэктыўны трылер… І паўсюль аўтар звяртаецца да вядомых літаратурных першакрыніц, ён нібыта пераконвае чытача, што нічога новага ў літаратуры ўжо не скажаш, таму, не хаваючыся, «пазычае» персанажаў, імёны і сюжэты з класічных твораў, апелюе да старажытных архетыпаў і міфаў.

Як і папярэднія творы, гэтая кніга Стаселькі надзвычай насычана дзеючымі асобамі. Большасць з іх — схематычныя і неабавязковыя для развіцця фабулы, што наводзіць на думку, нібыта яны створаны штучна, у пагоні за колькасцю. Зрэшты, калі ўлічваць звышзадачу, якую ставіць перад сабой аўтар, а менавіта: паказаць размаітасць і шматграннасць жыцця, сцвердзіць своеасаблівы «касмапалітызм», універсальнасць творчасці, то гэткі падыход выглядае больш-менш апраўданым.

Калі першы раздзел твора пад назвай «Ігдрасіль» малюе казачную, «кэралаўскую» атмасферу, то ўжо наступны, «Дзізаз», аганомшвае ідэяй, якая, па сутнасці, з'яўляецца дамінантай твора: наш свет адначасова існуе ў мноствах магчымых вымярэнняў. Любое дзеянне правакуе «эфект матылька», які змяняе абставіны і месца дзеяння да непазнавальнасці. Адсюль і шмат «варыяцый» лёсу галоўнага героя, закладзеных ужо ў самім імені: словазлучэнне «*vitae more*» з лацінскай можна перакласці як «больш жыцця».

У першых дзвюх частках галоўны герой — яўны нонканфарміст, шукальнік, які імкнецца трапіць у свет дарослых, каб у рэшце рэшт упэўніцца ў яго нелагічнасці і абсурднасці. Віта Морэ задае нязручныя пытанні свайму настаўніку, ставячы пад пагрозу агульнапрынятую мадэль светабудовы. За гэта юнак асуджаны на «дэматэрыялізацыю», але ў апошні момант яму ўдаецца збегчы. Цяпер яго лёс — гэта няспынныя ўцёкі, блуканні па розных вымярэннях, заблытванне слядоў. Таму калі ў «Дзізазе» месца дзеяння — умоўная планета ў аддаленай будучыні, а сам Віта Морэ навучаецца ў Ломузе — навучальнай установе, стэрыльны антураж якой нагадвае Касталію — краіну інтэлектуалаў, створаную Германам Гесэ ў раманеўтопіі «Гульня ў бісер», то наступныя раздзелы больш рэальныя, «зямныя». Напрыклад, «Загадка Сфінкса» — гэта прыгодніцкая аповесць, у якой галоўны герой разам са старэйшымі сябрамі ў пошуках рэдкіх выданняў трапляе ў Егіпет, дзе аказваецца ўцягнутым у барацьбу за ўладу сярод племені качэўнікаў-бедуінаў. Аповед, падобна казкам Шахеразады, шчодра аздоблены гісторыямі і прытчамі, загадкамі і таямніцамі. Кармічны кругаварот працягваецца — і ўжо ў наступнай частцы пад назвай «Завяшчанне» Віта Морэ — удзельнік самага сапраўднага герметычнага дэтэктыву, то-бок дзеянне адбываецца ў адасобленым, ізаляваным месцы — у дадзеным выпадку традыцыйна і прадказальна ў віктарыянскім асабняку. Кола падазраваных вельмі вузкае, а на першы план выходзяць не самыя лепшыя чалавечыя якасці ўдзельнікаў гісторыі. Класічныя «шкілеты ў шафе», сямейныя таямніцы — здавалася б, аматар жанру павінен быць усцешаны, калі б не відавочнае жаданне аўтара выкарыстаць фабулу і герояў дзеля чарговай порцыі даволі банальных філасофскіх разваг: «Кожны, ва ўсякім разе падсвядома, імкнецца пакінуць пасля сябе след… Мы розныя ў маштабах, але ў цэлым нават самы несамавіты, убогі і няварты чалавек спрабуе захаваць сябе ў прадметах і памяці іншых».

Цікавым падаецца жыццяпіс адной з варыяцый Віта Морэ ў раздзеле «Пакаранне». Гэта, бадай, адзіная гісторыя, набліжаная да сучасных беларускіх рэалій. Тут Віта Морэ ўжо не герой і не даследчык — перад намі расціснуты побытавымі праблемамі і непаразуменнем у сям'і шараговы супрацоўнік так званага Дэпартамента па этыцы. Стаселька па-свойму інтэрпрэтуе вядомую навелу Кафкі: сын Віта Морэ, які чамусьці гэтаксама, як і ў арыгінальным аповедзе, мае імя Грэгар, пераўтвараецца ў… яблык. Абсурднасці сітуацыі дадае канцоўка аповеду, у якой Віта Морэ гатуе з гэтага яблыка джэм і, каб палепшыць дабрабыт сям'і, вязе яго на рынак.

**Віта Морэ — нязменны ўдзельнік фантастычных гісторый і падарожжаў, ён імкнецца напоўніцу спасцігнуць жыццё ва ўсіх яго праявах. І паўсюль актуальнае пытанне выбару, бо, нягледзячы на знешнюю свабоду дзеянняў, галоўны герой застаецца вязнем свайго лёсу...**

Віта Морэ — нязменны ўдзельнік фантастычных гісторый і падарожжаў, ён імкнецца напоўніцу спасцігнуць жыццё ва ўсіх яго праявах. І паўсюль актуальнае пытанне выбару, бо, нягледзячы на знешнюю свабоду дзеянняў, галоўны герой застаецца вязнем свайго лёсу, пра што сведчыць эпізод у парыжскім парку, дзе сустракаюцца два Віта Морэ — стары і малады (знаўцы Борхеса адразу згадаюць навелу аргенцінскага класіка «Іншы»).

Несуцяшальны фінал твора, у якім мары і спадзяванні састарэлага Віта Морэ, увасобленыя ў сто тысяч папяровых жураўлікаў, робяцца сродкам «раскруткі» роліка на *YouTube* для амбіцыйных мігрантаў з Усходу.

Твор пакідае пасля прачытання даволі супярэчлівае ўражанне. З аднаго боку, пэўная прэтэнцыёзнасць, жанравая хаатычнасць, часам сюжэтная неарыгінальнасць ды неахайнасць тэксту здольныя сур'ёзна падпсаваць рэпутацыю аўтару, які ажыццяўляе планы па выданні сваіх кніг з дапамогай краўдфандынгу. І ў той жа час навідавоку неўтаймоўны творчы патэнцыял, незацугляная фантазія і філасофскі падыход да распрацоўкі матэрыялу, што ў сукупнасці пакідае пісьменніку шанец знайсці ў будучыні ўласны стыль — адметны і пазнавальны.

**Янка ЛАЙКОЎ**

# ХВІЛІНЫ ЗАМІЛАВАННЯ

Чаму чалавек піша вершы? Якая сіла прымушае складаць ці, як казаў Алесь Пісьмянкоў, думаць вершы? Мяркую, што на гэта пытанне ў кожнага паэта ёсць свой адказ. Адных перапаўняе пачуцце кахання і, каб прыгожа яго выказаць, закаханыя шукаюць рыфму. Другія прыходзяць да паэзіі праз чытанне літаратуры і любоў да яе. Трэція — праз любоў да роднай зямлі, яе рэчак, лясоў, азёр...

Творчасць паэта з горада Чавусы Магілёўскай вобласці Міколы Салаўцова, безумоўна, можна аднесці да кагорты песняроў роднай зямлі, пра што сведчаць зборнікі паэзіі «Азбука зорнага неба», «Жыцця акорды» і «Вясёлка лёсу». Вядомы ён і дзіцячай аўдыторыі кніжкамі «Вавёрчын веласіпед» і «Чаму плуг не ржавее», у якіх тэма любові да роднага краю дамінуе. Пра сваю творчасць паэт кажа з пэўнай доляй гумару:

*На маёй мяжы:*
*Праз дахі, сцены, агароджы*
*Лаўлю я імпульсы душы…*

Сёлета пабачыла свет кніга Міколы Салаўцова для дзяцей і падлеткаў «Нябесныя арэхі», выдадзеная Магілёўскай абласной узбуйненай друкарняй імя Спірыдона Собаля.

Назва кнігі прыцягвае ўвагу арыгінальнасцю, бо параўнаць нябесныя зоркі з арэхамі можа толькі чалавек, які глядзіць у начное неба з дзіцячым замілаваннем і фантазіямі. Многія паэты спрабавалі і спрабуюць пісаць вершы для дзяцей, але... Здзіўляе, што Мікола Салаўцоў ў сваім сталым узросце так тонка адчувае патрэбы дзіцячай душы. Напрыклад, як у вершы «Доктар Коцік»:

*У мяне жыў доктар Коцік,*
*Лапкай гладзіў мне жывоцік,*
*Футрай ручкі сагграваў*
*І фурчаў, фурчаў, фурчаў…*

У гэтых радках няма нечаканай навізны, але ж колькі ў іх шчырай замілаванасці ды цеплыні!

Ёсць у зборніку вершаў і сур'ёзныя творы. Ранняе дзяцінства аўтара супала з ліхалеццем вайны. Пра падзеі тых часоў ён распавядае ў аўтабіяграфічнай паэме «Цётка Наста».

Гэта рэальная народная гераіня, яна абараніла дзяцей, якія хаваліся ў вясковай лазні. Лазню хацелі падпаліць. Салдат ужо бег да яе з вогненным факелам. Жанчына спыніла злыдня сякерай...

Кніга Міколы Салаўцова «Нябесныя арэхі» зацікавіць як малых, так і падлеткаў, дый дарослыя знойдуць у ёй цікавае і карыснае, бо святло дзяцінства з намі заўжды.

**Віктар КУНЦЭВІЧ**

# У пошуках ісціны

Народная прымаўка вучыць: «Здзівіш — пераможаш!» Гэта можна сказаць і пра арыгінальную, нестандартную кнігу прозы Міколы Гарбачова, якая сёлета пабачыла свет у Мінску ў выдавецтве «Медысонт». Інтрыгуе ўжо назва: «Шлях да ісціны», — міжволі ўзнікае жаданне хаця б узяць у рукі гэтае выданне, пагартаць старонкі...

Цікавасць з'яўляецца з першага раздзелу кнігі, які называецца «Абрысы будучыні». У падзеях, тэндэнцыях мінулага і сучаснага аўтар спрабуе ўбачыць абрысы будучыні Беларусі, сваёй малой радзімы і асабістых лёсаў тутэйшых людзей. Не пакінуць абыякавымі апавяданні з красамоўнымі назвамі: «Дарога ў заўтра», «Вырашальны дзень», «Талака», «Моўныя карані». Гэтыя літаратурныя творы аздоблены сакавітымі эпітэтамі і параўнаннямі, займальна, з захапленнем чытаюцца. Некаторыя з іх аўтар змяшчаў для абмеркавання ў інтэрнэце. У кнізе прыводзяцца самыя розныя меркаванні, якія карыстальнікі пакідалі ў сеціве. Прытым надрукаваны яны без скарачэння і рэдагавання, на беларускай і рускай мовах, што захоўвае непаўторную адметнасць, своеасаблівасць кожнага з каментарыяў.

Спроба аўтара злучыць у адно цэлае перавагі кнігі як крыніцы разнастайных ведаў аб навакольным свеце і інтэрнэту як бязмежнай інфармацыйнай павуціны выклікае цікавасць і адабрэнне. Вядомая народная мудрасць сцвярджае: «Толькі ў спрэчках нараджаецца ісціна!». Таму інтэрнэт-спрэчкі на актуальныя тэмы ўспрымаюцца лагічна і да месца.

У апавяданнях і інтэрнэт-дыскусіях Міколы Гарбачова знайшлі адлюстраванне такія важныя тэмы, як працэс фарміравання беларускай нацыі і ўтварэння Беларусі як суверэннай, незалежнай краіны, інтэграцыя Беларусі і Расіі ў рамках Саюзнай дзяржавы, цяперашнія падзеі ва Украіне, у Сірыі і на Блізкім Усходзе, роля Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гадоў для беларускага народа і многія іншыя. Яны будуць цікавыя ўсім, каму неабыякавы лёс краіны.

**Тамара КРАСНОВА-ГУСАЧЭНКА**

# ЛІМБ #2: БЫЦЦЁ = НЕБЫЦЦЁ

**Карабель нашага крытычнага праекта зняўся з якара і нарэшце выйшаў у адкрытае мора, а гэта значыць, што надышоў час другога, лістападаўскага выпуску ЛІМба! Намі ўжо атрыманы заканамерны фідбэк ад самаабвешчанага бэст-оф-зэ-бэст-крытыка беларускай літаратуры, спадара А.Н. (за што дзякуем). Але такой невялікай увагі наўрад ці можа быць дастаткова, таму паўторна за-клі-ка-ем усіх-усіх чытачоў дасылаць нам свае згоды ці нязгоды з тым, што вы думаеце пра надрукаваныя ў ЛІМе вершы ці проста прапановы па тым, як зрабіць гэтую рубрыку цікавейшай (і спадара А.Н. таксама заклікаем да дыялогу — ці вы горшы за іншых?). Дасылайце свае каментарыі на нашу пошту *lim_new@mail.ru* з пазнакай «ЛІМб» — а мы ў той ці ў іншай форме адкажам на ўсё. І нарэшце — да галоўнай стравы — да крытыкі!**

Мінорнай халадэчай ахутваюць вершы **Бажэны МАЦЮК.** Аўтарка хістаецца ў павуцінні дзвюх вобразна-тэматычных узаемаскрыжаванняў: кахання і маўчання. Першае і другое з'яўляюцца падставамі для раскрыцця розных моцных бакоў паэткі. З глебы кахання зыходзіць багацце паэтычнае, вобразнае, яскравы прыклад якога — наступнае словазлучэнне: «адбываю бясконцы чынш на бясплоднай зямлі кахання». Вельмі дакладны вобраз з прыгукам рэчаіснаці, блізкай для беларускай паэтыкі. У сваю чаргу маўчанне паўстае ў творах сігналам да грамадска-філасофскага роздуму. І гэта не маўчанне слабасці, што надыходзіць з-за недахопу слоў, з-за агульнай моўнай кволасці, але маўчанне моцы — маўчанне, прага да якога можа ўзнікнуць толькі ў свядомых і адказных аўтараў, якія ведаюць сапраўдную цану словам.

Творчасць **Дар'і ШЭІНАЙ** падаецца на старонках ЛіМа адным вершам. Творы на тэму Дзядоў пранізаны хрысціянскасцю, але яна нічога не дадае вобразнасці: прысутнасць добра вядомых «Хрыста» і «Суднага часу» не скіроўвае верш у памастацку нечаканы бок. Толькі быццам адпрацоўваюць зададзеную аўтаркай праграму: напісаць верш пра Дзяды. Задача выканана: фармальна верш напісаны. Але ці дастаткова такога выключна фармальнага падыходу, калі нават да формы (як то дзеяслоўная недакладная (!) рыфма «плачу-страціў») ёсць пытанні?..

Большая частка падборкі **Змітрака МАРОЗАВА** складаецца з вершаў малой формы. І да такіх вершаў адразу ўзнікаюць пытанні: ці не пераацэньвае аўтар сваю афарыстычнасць, ці не спрабуе за кошт малых формаў проста зарыфмаваць выпадковую думку? І тут пачынаюцца складанасці. З аднаго боку, ёсць удалыя вобразы («чарніла начэй», «жыццё чалавека — як след бліскавіцы»), з другога — далёка не заўсёды атрымліваецца паспець «зачыніць» распачаты вобраз ці думку. Таму радкі ў большасці аднастрофій досыць разрозненыя па тых мастацкіх мэтах, што імі выконваюцца. Інакш выглядае чарговае (і зноў жа фармальнае), але ўжо іншага кшталту абмежаванне — гаворка пра «Санет Адаму Міцкевічу». Спачатку аўтар ухапіўся за выказванне Пушкіна наконт геніяльнасці Міцкевіча (і даў гэтае выказванне ў эпіграфе санета), а потым на працягу ўсяго санета суб'ектыўна апяваў беларуска-польскага аўтара і толькі ў канцы спаслаўся на словы «не-нашага ўсяго»: «Паэт — усім паэтам каралевіч, ты Аляксандра Пушкіна скарыў!» На ўзроўні зместу па-ранейшаму ніякіх адкрыццяў не адбываецца, але ў гэтым выпадку абраная паэтам цвёрдая форма іграе на руку агульнаму ўражанню. То-бок падборка Змітрака Марозава кранае хутчэй фармальныя бакі верша, толькі ў рэдкіх выпадках даючы раскрыцца думцы і вобразам адпаведным чынам.

**Міхась ШАВЕЛЬ** паўстае ў нумары тыповым карыстальнікам жанру «пейзажнай лірыкі», прытым у тыпова беларускіх тонах. Абодва вершы — пра вёску. У абодвух — двухстопны анапест. Паўсюль — «лясы», «бары», «родныя куты», «хаты», «песні», «дарогі» і г. д. На месцы «ракі» — збітая цукрова-флексійная «рэчачка». Радок «Мяне звала дарога», калі пачынаць вылічваць націскі, сведчыць пра глыбокую вясковасць аўтарскага стылю, а дакладна — арфаэпічных норм (бо на момант 2019 года цяжка ўявіць сабе паэта гарадскога паходжання, у чыім вакабуляры слова «звала» будзе з націскам на першы склад). Што цікава — з улікам усіх вобразных штампаў аўтар не выкарыстоўвае аніводнай дзеяслоўнай рыфмы, але не зразумела, каму за гэта дзякаваць: самому аўтару ці рэдактару лімаўскага аддзела паэзіі. У сукупнасці гэтыя два вершы выклікаюць крыху сюррэалістычнае адчуванне: калі чытаць іх па крузе, адзін за адным, можа падацца, што апынуўся у нейкай замкнёнай бэкетаўскай прасторы, дзе, ідучы з аднаго канца вёскі, безнадзейна апынаешся ў другім, а яе жыхары сядзяць на лаўках уздоўж дарогі і маўкліва ўсміхаюцца, назіраючы за бесперапынным і бясконцым блуканнем чытача-чужынца.

З дапамогай перакладчыцы Соф'і Шах паэт **Ізяслаў КАТЛЯРОЎ** з'яўляецца ў ЛіМе з урыўкам сваёй летапіснай паэмы «Замкавы час Беларусі». Увогуле, паняцце «летапіснай паэмы» ў літаратуразнаўстве не зацверджана, але, нягледзячы на гэта, можна бясспрэчна аднесці твор да дакументальнага жанру. І ў гэтым моманце адбываецца моцны зместавы канфлікт, бо для творчага поспеху аўтар павінен у невядомай прапорцыі сумясціць дзве сутнасна розныя стыхіі — гістарычны факт і паэтычную вобразнасць. І ў гэтай спробе аўтара знайсці адпаведную формулу, на мой погляд, адразу кідаюцца ў вочы дзве значныя недапрацоўкі не на ўзроўні гатовага тэксту, але на ўзроўні падыходу да яго. Першая з іх — нежывы суб'ект «паэмізацыі». З-за таго, што паэма паведамляе пра замкі, а не пра канкрэтнага чалавека ці групу людзей, яна набывае марудны пералічальны тон, які не выратаваць нават згадваннем гістарычных асоб. Другая недапрацоўка мне бачыцца ва ўключэнні прамога аўтарскага «Я» ў тэкст. Такі ход, з аднаго боку, дае прастору для суб'ектыўных адхіленняў ад гістарызму, для паэтызавання фактычнай тканіны, але з іншага — узнікае недапушчальная для такіх форм фамільярнасць і агульна несур'ёзны лад. Дарэчы, амаль бездакорным прыкладам так званай «летапіснай паэмы» можна палічыць паэму Нікалая Асеева «Сямён Праскакаў». У ёй адначасова на ўзроўні структуры твора паэтычны аўтарскі тэкст змешваецца з рэальнымі ўспамінамі байца Чырвонай Арміі, а таксама, паводле аўтарскай задумы, тэкст дазваляе сабе некаторыя мастацкія вольнасці ў аповедзе, які адхіляецца ад рэальнасці, але за кошт гэтага ўзмацняе эпічны стрыжань гісторыі. У першую чаргу твор працуе па правілах паэтычных і толькі потым — па гістарычных. У паэме Ізяслава Катлярова мусіць быць усё добра з фактычным аспектам, але было б добра пашукаць іншыя падыходы менавіта да паэтычнага афармлення.

Можна шмат чаго дараваць **Ірыне ПОЎХ:** і дзеяслоўныя рыфмачкі, і нейкую агульную жаноча-паэтычную наіўнасць, але зусім недаравальна, калі з дамскіх (нават не раманаў!) інтэрнэтных карцінак у літаратурна-мастацкія выданні прасочваюцца любыя нематываваныя і неіранічныя спалучэнні «восені» і «кавы». Упэўнены, часам нават у агідным мацюканні, якое тонкім сівым струменьчыкам выцякае з прагнілага трупа антыэстэтычнай вобразнасці, нашмат больш паэзіі, чым у гэтым пошлым спалучэнні. Часам шкада, што і ў нашы часы этыка, знаходзячыся на вагах прымальнасці, важыць больш за эстэтыку. Удвая шкада надзвычай добры белы верш, які ў кантэксце ўсёй падборкі можа папросту згубіцца. Калі б гэты твор ішоў у пачатку ці ў канцы, яму было б нашмат прасцей кінуцца ў вока чытачам, але самым уважлівым нават такая расстаноўка не перашкодзіць ухапіць сваю дробку сапраўднай паэзіі.

У вершах **Ігара ПРАКАПОВІЧА** пераплятаюцца тры ключавыя матывы: каханне, прырода і Бог. І быццам за адзін толькі набор тэм можна раззлавацца на аўтара і пачаць абвінавачваць у карыстанні ўжо даўным-даўно пратаптанымі і добра вядомымі ўсім творчымі сцежкамі, але не атрымліваецца. Нягледзячы на досыць знаёмыя вобразы, аўтар настолькі паспяхова валодае паэтычным мінімумам — эпітэтамі (і наогул пабудовай верша, ягонай архітэктурай), што верыцца калі і не ў шчырасць напісанага, то хаця б у мастацкую асэнсаванасць створанага. Зварот да Бога «Словы малітвы» напісаны з чаргаваннем чатырохстопнага і трохстопнага харэя і выключна мужчынскімі рыфмамі, што на ўзроўні формы надае твору належную манаскую сціпласць і адчужанасць. Верш «Хутар за рэчкай» радуе ўжо зместам: замест таго, каб бяздушна, быццам па нечым загадзе звыш, апяваць родны куток, паэт робіць з гэтай прасторы падставу для роздумаў аб пустаце і своечасовых пераходах быцця ў небыццё. Таму, хаця падборка і складаецца з дастаткова традыцыйнай паэзіі, гэта не надта перашкаджае атрымаць умераную порцыю заходаў у экзістэнцыяльнасць.

Творы **Кацярыны ТАРАСАВАЙ** чарговы раз пацвярджаюць выснову, якая датычыць сучаснай беларускай газетна-часопіснай паэзіі: калі вершы не падзяляюцца на чатырохрадкоўі, чытво будзе як мінімум цікавым. Аднак адзіны ў падборцы верш з чатырохрадкоўямі таксама знаходзіць, чым уразіць: праз увесь верш праходзяць параўнанні ліхтара з пальцам, а ягонага святла — з пярсцёнкам (і гэтыя вобразы не толькі досыць свежыя, але і дакладныя з пункту гледжання наяўнай падобнасці). У іншым вершы сустракаецца вельмі смелая рыфма «Анёл — агню», якая ўяўляе сабою дысананс, што замацаваны супадзеннем галосна-зычнага літаразлучэння «ан» (хай у другім слове яно і перабіваецца зычнай «г»). Апошні верш, верлібр, адметны сваёю «плавальнай суб'ектнасцю»: твор прадстаўляе некалькі герояў (улічваючы чытача), акрэслівае іх лёсы — а ў канцы аўтар быццам мяняе іх целамі, і з-за гэтай змены перспектывы пануючая ў тэксце фатальнасць ператвараецца ў больш звыклы, але і больш складаны спрадвечны непрадказальны хаос, згодна з якім усё на свеце знаходзіцца ў стане аднолькавай магчымасці жыцця і смерці. І гэта — вельмі моцнае і пераканаўчае завяршэнне для такой разнастайнай у сваіх мастацкіх праявах падборкі.

Кароткая нізка вершаў **Яны БУДОВІЧ** прыцягвае больш увагі першым яе тэкстам, — «На магіле Уладзіміра Караткевіча». І гэтага аднаго тэксту дастаткова, каб зразумець, што аўтарка з паэзіяй на «ты». Першыя некалькі радкоў цалкам складаюцца з метафар (і асабліва моцныя — першыя два: «У люстры граніту — бязмежжа блакіту»), кожная з якіх адлюстроўвае розныя станы быцця: жыццё і смерць. Далей верш павольна перацякае ў апісанне прыроды, але гэта не апісанне дзеля апісання: у ім зноўку сыходзяцца жыццё («мурашы») і мёртвае («лісце сухое»), каб пасля перацячы ў прымірыцельнае «што будзе й было, паяднана ў адно». І гэтая самая думка, праходзячы праз пэўныя метамарфозы, апынаецца ў апошнім радку, пры гэтым не губляючы сваёй афарыстычнасці («…Ты быў, але будзеш і ёсць»). Калі верш заканчваецца, становіцца зразумелым, што самы першы вобраз твора («люстра граніту») насамрэч ужо з самага пачатку падае думку аб неразрыўнасці быцця-небыцця, але толькі с развіццём верша яна паціху выходзіць наверх. Фінальны зварот, як часта бывае з выдатнай паэзіяй, — гэта зварот не толькі да адрасата з загалоўка, Уладзіміра Караткевіча, але і да кожнага, хто памёр, існуе ці толькі збіраецца нарадзіцца. Усё ж сапраўды: тыя вершы сапраўдныя, што злучаюць людзей. Тыя, што ставяць знак роўнасці між чалавекам і чалавецтвам.

***Лістапад у лімаўскай паэзіі выдаўся няроўны. З аднаго боку — моўная статыка, восеньскія клішэ, дакументальная апаэтычнасць і наўпрост нуда. З другога ж — экзістэнцыяльныя хістанні між жыццём і смерцю, паўмартальныя гульні з паэтычным суб'ектам і бясконцы чыніш. Але… ці не адначасова ў пасіўнай нудзе і ў актыўных унутраных ваганнях уся сутнасць восені? Падаецца, крыўдзіцца тут няма на што: нават дрэнныя вершы, як паслязалеўная слата, — гэта толькі частка адной вялікай складанай сістэмы, імя якой «літаратурны працэс». І застаецца толькі спадзявацца на тое, што вершы зімовых нумароў «ЛіМа» будуць хоць і спрэчныя, але не зусім інэртна-паўмёртвыя, чый лёс — смактаць разам з мядзведзямі агульную настраёва-кліматычную лапу.***

**Даніїл ЛЫСЕНКА**

## Мікола МЯТЛІЦКІ

***

*У мроях сваіх ён убачыў цябе, Беларусь,*
*І вярнуўся, і зліўся душой,*
*П'ючы зыркія промні маленства —*
*Цяпло рос твайго поплава даўняга,*
*Ступіў басанож на пракаветны бальшак*
*Прыцьмела-запыленай гісторыі нашай*
*І крок за крокам, упарта,*
*Дыхаючы на ўсе збалелыя грудзі,*
*Рушыў у будучыню — панёс*
*Натхнёнае гарачае сэрца.*
*І з мрояў-вершаў яго адлітая,*
*Ты, Айчына мая высненая,*
*Явай дня новага сталася,*
*З душою ягонай злілася,*
*І ён сонцам узышоў над табой —*
*У кожнае сэрца красае агонь*
*Натхнёнага Духу,*
*Дае надыхацца напоўніцу кожнаму*
*Свежым паветрам Айчыны,*
*У моц паверыць сваю чалавечую,*
*Ён,*
*Наш юны геній —*
*Максім Багдановіч.*

***

*Вочы у вочы — продкі і мы.*
*Колькі нам кажа іх позірк нямы*
*З прошласці даўняй, таемнай, як сон,*
*Нашыя думкі забраўшы ў палон,*
*Мудрых казанняў, як правільна жыць,*
*Меней гузоў у адчаі набіць,*
*Болей духоўнага скарбу набыць.*

*Толькі, на жаль, мы іх чуем, калі*
*Робіцца пеклам жыццё на зямлі.*
*Помачы просім, заступніцтва ў іх,*
*Бо не хапае сіл скутых сваіх*
*Зрушыць пастылую цемру начы,*
*Новае зло перамагчы,*
*Вырваць Жыццё з крыважэрнае цьмы.*

*Вочы у вочы — продкі і мы.*

***

*Мы імя сваё гордае*
*Неаднойчы крывёю гарачай*
*Напісалі на лёсу скрыжалях*
*У сечах, пазначаных стратамі.*
*Мы прад ворагам кожным,*
*Свой баронячы край, не дрыжалі*
*І сумленна палеглі*
*На абсягах Еўропы*
*Салдатамі.*

*У страі баявым*
*Неаднойчы прайсціся нам выпала,*
*Ды, адрынуўшы зброю,*
*На руінах жыццё адрадзілі.*
*Хоць нялёгкая доля*
*Чашу слёз і крыві нашай выпіла,*
*Не счарсцвелі душой,*
*Чалавечнасці мы не згубілі.*

*Беларусы, сягоння мы*
*Светам абсяжным пачутыя,*
*Наша кожнае слова*
*На шалях сумлення узважана.*
*З тымі мы, хто спазнаўся*
*У лёсе з такімі ж пакутамі,*
*Хто жыве на зямлі,*
*Як і мы,*
*Не прадажна.*

*І такіх з кожным днём*
*На прасторах зямных усё большае,*
*Не задушыць наш голас*
*Крывадушнікаў зграя пражэрная.*
*Мы спазналі не раз*
*За жыццё сваё*
*Самае горшае,*
*І сумленню свайму*
*Застанёмся заўсёды мы*
*Вернымі.*

***

*У Вязынку прыходзяць на Купалле*
*Гарэзныя дзяўчаты, юнакі:*
*На курганах кастры да ранку паляць*
*І плынь ракі ўбіраюць у вянкі.*

*У іх сардэчных клопатаў нямала,*
*Свой хочуць лёс шчаслівы напаткаць.*
*Іх на стагоддзі ўсе натхніў Купала*
*Пад небам кветку-папараць шукаць.*

*Буяе ў травах маладое лета,*
*Пагодна акунаецца ў зару.*
*І б'ецца сэрца вечнае Паэта,*
*І моліцца штодня за Беларусь.*

***

*Пабачыць пашчасціла рэкі і горы,*
*У стэпе пабыць, наблукацца тайгой,*
*Зямлі неабдымнай адкрыўшы прасторы,*
*Развітвацца з імі з заўсёднай тугой.*

*Імкнуцца ўсё дальш і прыйсці на край свету —*
*Убачыць магутны буян-акіян;*
*Схадзіўшы наўсцяж немалую планету,*
*Прыкмеціць аседлыя справы зямлян.*

*Паўсюдна турботай занятыя людзі,*
*Паўсюдна прыспешваюць клопатна дні.*
*І наша жыццё анідзе не пазбудзе*
*Залішняй падзённай жывой мітусні.*

*І толькі начамі, знайшоўшы адхланне,*
*Спачнём пад наглядам нябесных свяцілі,*
*Каб потым прачнуцца і зноўку ў світанне*
*Ўварвацца з энергіяй, свежасцю сіл.*

*Мы, дзеці планеты, з'яднаныя рухам,*
*Ужо нам зацесна сягоння на ёй.*
*Аднойчы акрэплі душой мы і духам,*
*Змаглі паквітацца з пячорнай імглой,*

*Смялей пазірнулі на звабныя зоры,*
*Праехалі ўсцяж, а падчас — праплылі.*
*Скарыць нам па сіле і рэкі і горы,*
*І нават — парваць прыцягненне Зямлі.*

***

*Грамагучнаю хваляю радасці*
*Дзень гэты летні*
*Перагукнуўся з памятным днём*
*Вызвалення,*
*Калі першымі крокамі*
*Свабода ўступіла*
*На зруйнаваныя вуліцы Мінска*
*І, выдыхнуўшы на ўсе грудзі*
*Пераможна-раскацісты вокліч,*
*Злілася са слязінаю шчасця.*

*Грукаталі пераможна гарматы,*
*Грукалі-біліся пераможна сэрцы,*
*У пераможны галас*
*Зліваліся галасы…*
*Мянялася паветра само*
*Над руінамі і ў ацалелых пакоях*
*На пераможнае,*
*І нават кроў у чалавечых*
*Артэрыях і венах*
*Быць перастала баяцца чырвонай…*

*І вось грамагучна —*
*Чаканным крокам парада,*
*Залпамі салюту святочнага —*
*Перагукнулася памяць Айчыны*
*З гулам дня незабыўнага,*
*З якога і вырасла,*
*Увабралася ў сілу*
*Акрываўленая Незалежнасць,*
*Каб на магутных далонях*
*Трымаць*
*Наша жыццё чалавечае…*



## Валерый КУХАРЧУК

### З Максімам на Хілкрэст-авеню

*Пад потам*
*салёнай Атлантыкі*
*над Юцікай у штаце Нью-Ёрк*
*часцей абуджаецца ў памяці*
*чарнаморскі ялцінскі брыз.*
*Мо ўжо сотню гадоў*
*асвячае ён сціплы*
*прытулак паэта.*
*Там, у Ялце, я быў*
*аднагодкам Максіма.*
*На Хілкрэст-авеню*
*дапасую, як бач, у бацькі.*
*Там і тут*
*з ім аднолькава мы чужынцы,*
*адарваныя ад Айчыны,*
*хоць асуджаны часам-адлегласцю*
*на немажлівасць суіснавання.*
*Ды зламаў*
*скрыжалі стэрэатыпу*
*і спраміў*
*спіралі гісторыі*
*звычайны маленькі цуд.*
*Неяк ранкам*
*на падаконнай клумбе*
*маёй амерыканскай кватэры*
*зорачкаю блакіту*
*заззяў васілёк.*
*Скуль трапіў ён у глебу*
*зямлі заморскай, камяністай?*
*Няйнакш драбінаку Радзімы*
*нябачнай ветравай рукою*
*падкінуў мне Максім.*
*Ну, вось цяпер і я ўжо не самотны.*
*Бо й на чужыне сябра маю.*
*І сярод «містараў» ды «місіс»*
*з ім, як з Максімам насамрэч,*
*заўзята гутарым па-беларуску.*

### У горадзе Купера

*Над Куперстаўнам —*
*нью-ёркская восень.*
*Барву цукровых клёнаў*
*падсвечвае елавасць*
*канадскага дуба.*
*Вясны тут, бадай, не бывае.*
*Следам за волкасцю паслязім'я*
*адразу ўзрываецца лета.*
*А восень трывала*
*трымае сваю зіхатлівасць*
*да новых утокаў*
*крыштальнага паркалю.*
*Толькі ў возера Война*
*хтосьці перакуліў*
*чарніліцу з фіялетам.*
*Мо таму яшчэ больш пабялеў*
*тлусты іерогліф стралы*
*на пляскатым памосце ўзбярэжжа,*
*скіраваны сваім вастрыём*
*углыб ваколлюстраной падковы,*
*дзе пагойдваецца на ленаватых хвалях*
*плыткі трысняговы дамок.*
*Тут калісьці*
*раскурвалі люльку міру*
*ці адкопвалі сякеру вайны*
*ганарлівыя воі плямён*
*Лігі Іракезаў.*
*Ды зазубрыўся тамагаўк,*
*зламаліся пругкія стрэлы*
*легкаверных і вольналюбівых*
*абарыгенаў*
*аб свінцовыя градзіны*
*крамянёвых пішчаляў*
*бледнатварых захопнікаў-місіянераў.*
*Напамінам адно*
*тых самотных часін*
*застаецца ўтравелы курган*
*з тужліваю вартаю*
*шэрых таўсматых бяроз*
*(беластволыя штосьці*
*не надта растуць*
*на слязамі-крывёю*
*прасоленай некалі глебе*
*заакіянскага кантыненту).*
*І надбрацкамагільная*
*абамшэлая бетонная пліта*
*з позвай-перасцярогаю*
*да паразумнелых нашчадкаў:*
*«Белы чалавек!*
*Ты прыйшоў на нашу зямлю.*
*Зараз гэта твая зямля.*
*Мы падалі табе*
*руку дружбы,*
*якая стала*
*нашай магілай...»*
*...Але й цяпер*
*крыляе над акругай Атсега*
*ў штаце Нью-Ёрк*
*няскораны дух*
*апошняга з Магікан...*

Фота Кастуся Дробава.

## Конкурс «ПЕРШАЦВЕТ»

## Дар'я ВЯЧЭРКА

### Максіму Багдановічу

*Маці прынесла торбачку з крамы,*
*што вабіць і кліча дзіцячай спакусай —*
*як і калісьці, купіла мне мама*
*салодкія палачкі кукурузы.*

*І як быццам у сне, я гляджу ў нікуды:*
*на асфальце ад фарбы і бруду сляды,*
*не знаходзяць цяпла ля пад'ездаў каты...*
*А я мрою сустрэцца з табой, нібы з цудам...*

*Ты хадзі да мяне*
*(я сяджу ў акне),*
*пагаворым,*

*Максім Багдановіч!*

*...І слухаем моўчкі: імчыцца «КамАз»*
*ды верш ажывае на белі паперы.*
*Самалёт зіхаціць (мо заўважыў і нас?),*

*ці то зорка Венера?*

*Чакалі святла, але час надышоў*
*непазбытнай тугі і нязрушнага грузу,*
*адзіноты і суму буйных гарадоў...*

*Дзякуй,*
*Максіме,*
*што падышоў.*

*Пачастуйся хоць палачкамі кукурузы!..*

# Гутаперчавы клоўн

*Урывак з рамана*

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

У першыню Марынка пабачыла цацачнага клоўна два тыдні таму, калі спускалася па лесвіцы, накіроўваючыся ў краму. Цацка ляжала на прыступках паміж другім і трэцім паверхамі… Дакладней, не ляжала, а стаяла, уткнуўшыся размаляваным тварыкам у прыступку.

Першым памкненнем Марынкі было падняць цацку, якую хтосьці, здаецца, згубіў. Не для таго, каб прысвоіць — проста пакласці на падаконне — там яе гаспадар заўважыць хутчэй. Дзяўчынка нават схілілася, працягнула да клоўна руку, але потым чамусьці перадумала. Паціснула плячамі і рушыла далей.

Паход у краму і назад заняў у Марынкі дзесьці з паўгадзіны, а можа, і больш. Калі яна зноўку зайшла ў пад'езд і пачала ўздымацца па лесвіцы, то і думаць забылася пра гэтага клоўна, якога хтосьці згубіў. І ўспомніла тады толькі, калі ўбачыла зноўку.

Раптам дзяўчынцы штосьці падалося дзіўным у гэтай маленькай цацачнай фігурцы, але Марынка доўга не магла ўцяміць, што. А потым раптам зразумела: цацку хтосьці перасунуў. Ну, так і ёсць: знаходзілася яна зараз не на сярэдзіне лесвічнага пралёту, як гэта было з паўгадзіны таму, а на самай верхняй ягонай частцы.

Праўда, тады яшчэ Марынцы і ў галаву прыйсці не магло, што гэтую даволі значную адлегласць клоўн пераадолеў самастойна. Вядома ж, яго хтосьці пераставіў, толькі вось навошта, з якой мэтай? Альбо суседскія дзеці такім чынам забаўляюцца?

Вырашыўшы, што так яно і ёсць, Марынка, вядома ж, не стала ўмешвацца ў дзіцячыя гульні. Проста асцярожна абышла клоўна і пайшла па лесвіцы. Тым больш што бабуля, пэўна ж, ужо зачакалася свайго любімага «барадзінскага»…

А потым, уначы, Марынцы раптам прысніўся сон. Страшны і нават жудасны. Быццам сядзіць яна глыбокай ноччу адна ў сваім пакоі і глядзіць па тэлевізары нейкі фільм жахаў. Аб чым менавіта быў фільм, гэтага Марынка не памятала... Але раптам ёй падалося, што экран тэлевізара — зусім і не экран нават, а нейкая вялізная адтуліна, і тэлевізійныя монстры вельмі лёгка могуць з яе трапіць сюды, у пакой. І гэта проста цуд, што пачвары яшчэ не заўважылі гэтага пераходу і не выкарысталі яго…

Уся здранцвелая ад жаху, Марынка паспрабавала ўскочыць з крэсла і выключыць тэлевізар, але чамусьці так і не змагла. А дзеянне на экране працягвалася... І ўсё часцей выродлівыя стварэнні з таго боку экрана пазіралі на Марынку і аб чымсьці нават перашэптваліся. І кожны раз у дзяўчынкі ад жаху перахоплівала дыханне, вельмі карцела закрычаць, але яна баялася варухнуцца.

А потым з тэлевізара раптам высунулася рознакаляровая галава клоўна. Яго белы з ярка-чырвонай нерухомай усмешкай твар быў звернуты прама да Марынкі. І яна зразумела, што жудасная пачвара вось-вось цалкам вылезе з экрана…

Вось тут Марынку, што называецца, прарвала, і яна закрычала. Ды й так гучна, што ў пакой адразу ж прыбеглі і маці, і бабуля. Бабуля, праўда, хутка пайшла спаць, а паміж Марынкай і маці адбылася доўгая і даволі непрыемная размова. А потым, пакідаючы пакой, маці паабяцала заўтра ж выкінуць на сметніцу ўсе дыскі дачкі з «гэтымі дурацкімі страшылкамі».

Праўда, што канкрэтна прыснілася ёй, Марынка ні маці, ні бабулі так і не расказала. Прамармытала толькі, што прыснілася штосьці жудаснае, а што канкрэтна, не памятае.

Але ж яна памятала! Памятала ўвесь той жах, які ахапіў яе, калі з'явіўся ў тэлевізары размаляваны твар клоўна са злавеснай усмешкай!

Хто сказаў, што дзеці любяць клоўнаў? Гэта глыбока памылковае перакананне дарослых, калі гаворка ідзе не пра падлеткаў, а пра зусім маленькіх дзяцей. Яны клоўнаў не толькі не любяць — нават крыху пабойваюцца як чагосьці не зусім натуральнага.

Гэты ярка размаляваны нерухомы твар з нязменнай шырокай усмешкай, гэтае стракатае ўбранне блазна, якое так недарэчна, з пункту гледжання дзіцяці, глядзіцца на дарослым чалавеку…

Потым, з узростам, гэтая дзіцячая «клоўнафобія» знікае без астатку, і ў большасці падлеткаў (ва ўзросце Марынкі і нават маладзейшых за яе) выгляд страката размаляванага артыста нічога, акрамя вясёлага смеху, не выклікае.

У большасці, але не ва ўсіх.

У Марынкі, напрыклад, гэты страх застаўся. Магчыма, таму, што ва ўзросце шасці гадоў яе вельмі перапалохаў (сам таго не жадаючы) адзін цыркавы клоўн.

Мала што засталося ў памяці Марынкі з таго даўняга цыркавога відовішча, на якое павялі яе мама і тата (ён тады яшчэ жыў разам з імі). Але ёй зусім не было смешна. Дзяўчынка шчыра не магла зразумець, чаму ўсе астатнія (у тым ліку і мама з татам) весела смяюцца і дружна пляскаюць у ладкі. А калі на арэне з'явіліся вярблюды, Марынку раптам ахапіў такі жах, што яна адразу ж заплюшчыла вочы і прыхілілася да таты як да самага надзейнага абаронцы. Дзяўчынцы раптам падалося, што гэтыя вялізныя і такія злыя з выгляду жывёліны раптам кінуцца сюды і пачнуць таптаць і хапаць зубамі гледачоў у першых радах, якія пакуль што ні аб чым не падазраюць і таму працягваюць пляскаць у ладкі і весела смяяцца. А ў Марынкі з бацькамі, як на тую злосць, менавіта першы рад!

Праўда, вярблюдаў хутка вывелі з арэны і дзяўчынка крыху супакоілася. Перажывала потым за паветраных гімнастаў, але і ў іх усё скончылася без нейкіх асаблівых здарэнняў.

А потым на арэну выбеглі дарослыя, злавесна размаляваныя дзядзькі. Ажно тры…

Гэтых незвычайных дзядзькаў Марынка адразу ж спалохалася. Не так, як вярблюдаў, але ёй стала раптам вельмі і вельмі страшна. І яна плаксівым шэптам пачала прасіць маму (тату было прасіць безвынікова, ён тады цалкам знаходзіўся пад маміным уплывам), каб тая як мага хутчэй вывела яе адсюль.

— Не выдумляй! — таксама шэптам, рэзка адказала дзяўчынцы мама. — Глядзі лепш на клоўнаў!

Так Марынка даведалася, як называюцца гэтыя злавесна размаляваныя дзядзькі. А потым адзін з іх апынуўся зусім побач з іх крэсламі, павярнуўся ў бок Марынкі і, шырока ўсміхаючыся дзяўчынцы нерухомымі чырвонымі вуснамі, працягнуў да яе рукі…

Што адбылося далей, Марынка не памятала. Па словах маці, яна адчайна залямантавала і страціла прытомнасць, перапалохаўшы клоўнаў і сарваўшы ім усё выступленне. Але бацькі не сталі сварыцца на дзяўчынку. Прыехала «хуткая дапамога», якая і даставіла Марынку разам з усхваляванымі бацькамі ў найбліжэйшую бальніцу. А ўжо адтуль дадому яны дабіраліся самастойна, на таксі.

Пасля гэтага ў цырк Марынку больш не вадзілі (ды яна і сама не асабліва жадала). А ў хуткім часе і тата назаўсёды знік з іх жыцця, і на ўсе пытанні Марынкі, куды ўсё ж падзеўся тата, мама нязменна адказвала, што ён іх кінуў. І гэтак жа нязменна дадавала напрыканцы:

— Падрасцеш — сама ўсё зразумееш!

І Марынцы пасля гэтых загадкавых маміных слоў вельмі хацелася як мага хутчэй вырасці. Чамусьці ёй здавалася, што менавіта тады тата абавязкова вернецца.

Зараз жа, навучаючыся ўжо ў сёмым класе, Марынка добра разумела, што тата ніколі да іх не вернецца. Бо ў яго цяпер іншая сям'я ў іншым горадзе і другая дачка, якая, вядома ж, намнога маладзейшая за Марынку. Але сваю амаль родную сястру Марынка ніколі не бачыла, бо яе маці, другая татава жонка, была катэгарычна супраць любых зносінаў мужа з ранейшай сям'ёй. Праўда, аліменты тата заўсёды выплачваў рэгулярна і ў поўным аб'ёме, а большага ад яго (па словах бабулі) і не патрабавалася.

Марынка была з бабуляй цалкам згодна. Ім добра жылося ўтрох, і калі маці аднойчы асцярожна пацікавілася ў дачкі, як бы яна паставілася да таго, каб Віктар Мікалаевіч (быў такі мамін знаёмы, заходзіў да іх зрэдку) пераехаў сюды жыць, Марынка закаціла такі грандыёзны скандал, што маці больш пра гэта нават не заікалася. Толькі сумна ўздыхнула...

Бабуля таксама ўздыхнула і нечакана заявіла Марынцы, што яна расце эгаісткай. А потым, павярнуўшыся да маці, дадала, што няма чаго звяртаць увагі на дурацкія (так і сказала) капрызы дачкі, а час ужо і пра асабістае жыццё падумаць.

Гэта было ў мінулым годзе, калі Марынка вучылася яшчэ ў шостым класе. Цяпер яна заканчвала сёмы, а маміна асабістае жыццё ні кропелькі не змянілася.

Як не змяніліся і недаверлівыя адносіны самой Марынкі да ўсіх ярка размаляваных клоўнаў.

Не, яна нічога не мела супраць клаўнады таго ж Нікуліна альбо, скажам, Карандаша. Так, на погляд Марынкі, і павінны былі выглядаць сапраўдныя цыркавыя комікі.

Клоўн, які прысніўся ёй ноччу, быў несапраўдны. І вельмі жудасны.

Яшчэ ён быў вельмі падобны на таго цацачнага клоўна, якога яна бачыла вечарам на лесвічнай пляцоўцы.

А раніцай, выходзячы з кватэры, Марынка раптам са здзіўленнем (і нават з жахам) убачыла, што за ноч клоўн паспеў пераадолець ужо ўсе чатыры паверхі і знаходзіўся зараз на самай сярэдзіне апошняга лесвічнага пралёту. Хоць, магчыма, хтосьці з суседскіх дзяцей проста перанёс яго сюды. Вечарам ці нават сённяшняй раніцай.

Як бы там ні было, але Марынка вырашыла раз і назаўсёды пазбавіцца ад гэтай злавеснай цацкі. Нахілілася, падняла (здзівілася, які ён цяжкі) і, выйшаўшы на вуліцу, шпульнула клоўна ў сметніцу.

У школе ў гэты дзень павінна была адбыцца кантрольная па англійскай, потым — доўгачаканая экскурсія ў музей, так што Марынка зусім забылася пра цацку, якую выкінула. І толькі ўвайшоўшы ў свой пад'езд і ўжо ўзнімаючыся па лесвіцы, яна зноўку ўспомніла пра клоўна. І нават спынілася на пляцоўцы другога паверха, зразумеўшы раптам, што баіцца. Баіцца незразумелай цацкі, баіцца таго, што зноў сустрэнецца з ёй на адным з лесвічных пралётаў.

Далей яна ішла вельмі павольна, насцярожана азіраючыся па баках. І толькі дасягнуўшы пятага паверха, уздыхнула з палёгкай.

Цацачны клоўн нідзе не трапіўся, а значыцца, гэта была простая цацка, якую альбо выкінулі, альбо згубілі… Альбо чыйсьці недарэчны жарт.

А ноччу Марынцы зноўку прысніўся кашмар, вельмі падобны на папярэдні. З той толькі розніцай, што на гэты раз клоўн глядзеў на Марынку праз акно і гэтак жа сама ёй усміхаўся мёртвай усмешкай. А белыя, тоўстыя, падобныя на сардэлькі, пальцы жудаснай істоты ліхаманкава мацалі аконнае шкло...

І зноўку Марынка прачнулася ад уласнага пранізлівага крыку. І залямантавала яшчэ гучней, калі здолела, адшукаўшы ў цемры выключальнік, запаліць у пакоі святло.

Маленькі цацачны клоўн стаяў каля падаконня і, здавалася, вачэй не зводзіў з перапалоханай дзяўчынкі.

І зноўку ў пакой адначасова ўбеглі і маці, і бабуля. І маці адразу ж кінулася да Марынкі і пачала трэсці яе за плечы, а бабуля кінулася на кухню па ваду.

Потым Марынку паілі вадой (дакладней, спрабавалі гэта зрабіць). І яна, скаланаючыся, нібыта ў ліхаманцы, толькі тыцкала і тыцкала дрыжачай рукой у бок злавеснай цацкі.

— Забярыце яе! Забярыце адсюль!

Бабуля нарэшце азірнулася і таксама заўважыла клоўна.

— Што гэта? — з недаўменнем спыталася яна, падыходзячы да цацкі і ўздымаючы яе. — Ого, цяжкая якая!

— Гэта я! — вінавата прамовіла маці. — Разумееш, я гэтую цацку ўвечары каля нашых уваходных дзвярэй заўважыла. Ну і... узяла...

— Ты як маленькая! — незадаволена буркнула бабуля. — Быццам не ведаеш, як Марынка да клоўнаў ставіцца!

— Ды ведаю я! — усё гэтак жа вінавата адазвалася маці. — Не падумала проста! Дакладней, вырашыла, што гэта сама Марынка яго сюды прынесла і незнарок каля ўвахода пакінула…

— Дык гэта ты яго сюды прынесла! — ужо з уяўнай палёгкай уздыхнула Марынка. — А я, дурніца, і не заўважыла ўчора!

— Гэта таму, што я яго на палічку паставіла, — растлумачыла маці. — А як ён каля акна апынуўся — не ведаю нават…

— Зваліўся, пэўна... — выказала здагадку бабуля. — І Марынку пабудзіў...

Марынка хацела было запярэчыць, што цацачны клоўн нават калі б і зваліўся ноччу з палічкі, аніяк не змог бы самастойна дакаціцца да акна. Ды яшчэ і не проста валяцца там, а стаяць навыцяжку, павярнуўшыся размаляваным тварам у бок тахты, на якой спала Марынка.

Але, зірнуўшы ў напружаны ўсхваляваны твар маці, Марынка так нічога і не сказала. А бабуля, засунуўшы цацачнага клоўна ў кішэню халата, выйшла.

— Я яго ў сябе пакіну, — сказала яна, азірнуўшыся. — На тэлевізар пастаўлю…

Наогул, тэлевізар быў у зале, вялікі, насценны, але бабуля ў сваім пакоі трымала яшчэ і маленькі, чорна-белы, і была вельмі да яго прывязаная. Магчыма, тэлевізар нагадваў ёй пра маладосць...

# «Слуцкія ткачыхі»: першы перакладчык

**Яшчэ пры жыцці Максіма Багдановіча яго верш «Слуцкія ткачыхі» быў перакладзены на польскую мову і апублікаваны ў часопісе «Wieś Ilustrowana» (1913, № 9. С. 31). Верш на польскую пераклаў літаратар, паэт, педагог і перакладчык Юзаф Вяжынскі (1871—1941). Часопіс «Wieś Ilustrowana» апублікаваў «Слуцкія ткачыхі» па-беларуску і па-польску.**

Пры жыцці беларускі літаратуразнавец і мой зямляк Янка Саламевіч (1938—2012) вельмі зацікавіўся асобай Юзафа Вяжынскага. Шукаў пра яго звесткі, але да канца справу не давёў. Мне выпала дапамагаць яму ў пошуках матэрыялаў пра першага перакладчыка «Слуцкіх ткачых». За час пошукаў мы даведаліся пра тое, што Юзаф Вяжынскі шчыра сябраваў з мастаком Фердынандам Рушчыцам (1870—1936).

Юзаф Вяжынскі і Фердынанд Рушчыц разам вучыліся ў 1883—1890 гадах у Мінскай дзяржаўнай класічнай гімназіі. Вось як згадвае Юзаф Вяжынскі пра сябра: «Фэрдзя быў першым вучнем на працягу ўсёй вучобы ў гімназіі, яго імя штогод змяшчалася на залатой табліцы. Для яго не было цяжэйшых і лягчэйшых прадметаў, як па лаціне ці грэцкай, так і па рускай мовах і матэматыцы ён атрымліваў самыя высокія адзнакі. Быў не толькі здольны ў навуках, але і ўпарты ў працы». На працягу ўсёй вучобы Фэрдынанд наведваў урокі малюнка. У Вільні яны нават пэўны час жылі ў адным доме. А ў пачатку 1930-х гадоў ездзілі разам на Крэўскі замак. Вяжынскі нават напісаў артыкул пра свайго сябра і мастака Рушчыца: «Dzieciństwo i młodość Ferdynanda Ruszczyca» (Ferdynand Ruszcyc — życie i dzieło Wilno, 1939. S. 23).

Да 1919 года Вяжынскі быў сябрам камітэта, які аднаўляў Віленскі ўніверсітэт, нават пэўны час быў там выкладчыкам, а таксама прысяжным перакладчыкам акруговага суда ў Вільні. Ён часта чытаў лекцыі пра творчасць свайго сябра-мастака. Пахаваны на бернардзінскіх могілках.

*Міхаіл Бліщ «Слуцкія ткачыхі». 1959 г.*

А вось верш славутага класіка на польскай мове ў перакладзе Юзафа Вяжынскага і ў арыгінале.

## Слуцкія ткачыхі

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад пярсідскі ткуць яны.
А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Халодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука
Заміж пярсідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

Słuckie tkaczki
Z rodzimych niw, z rodzimej chaty
Na pański dwór dla marnej krasy
Wzięto bezdomne, bez zapłaty
Tkać one złotolite pasy.
I cięgiem w długie te godziny,
Dziewicze zabaczywszy sny,
Szerokie, barwne swe tkaniny
Przetykasz na wzór perski ty.
Za ścianą tuż wre śmiechem pole,
Przyświeca niebo z okna krat
I dumka rwie się mimo woli
Tam, kedy wiosną zakwitł świat
Gdzie lśni się zboże w jasnej dali,
Bławatków gdzie modrzeje łan,
Gdzie chłodem srebra drga grzbiet fali
Rzeki, pędzącej z góry w tan,
A w dali ciemna obrzeż boru...
I w zapomnieniu z pod twych rąk
Zamiast obcego Persów wzoru
Wykwitł bławatków swojskich pąk.

Застаецца толькі здагадвацца, ці бачыў гэтую публікацыю аўтар бессмяротных радкоў Максім Багдановіч.

**Сяргей ЧЫГРЫН**

# ЗААКІЯНСКІ ДЭБЮТ БАГДАНОВІЧА

**У 1916 годзе ў Скрэнтане (ЗША, штат Пенсільванія) выйшаў нарыс Максіма Багдановіча «Угорская Русь» у перакладзе на ўкраінскую мову Антона Рэвюка. «ЛіМ» ад 10 жніўня 2018 года ўжо падзяліўся гэтай сенсацыйнай знаходкай. А цяпер адзін экзэмпляр малафарматнага, у далонь, выдання, разлічанага на шырокую аўдыторыю, захоўваецца ў Нацыянальнай бібліятэцы Украіны імя У. І. Вярнадскага.**

«Угорская Русь» дэманструе асобныя грані таленту класіка беларускай літаратуры, яго рускамоўную творчасць. Нарыс створаны ў кантэксце шэрагу падобных навукова-папулярных прац, запатрабаваных у Расійскай імперыі ў час Першай сусветнай вайны і звязаных з тагачаснай актуалізацыяй славянскага пытання. У аўтара гэтых радкоў было некаторае шкадаванне адносна таго, што ў 1916 годзе ў ЗША быў апублікаваны пераклад не ўласна беларускамоўнай творчасці «песняра чыстай красы». Гэтае пачуццё развеялася, калі быў выяўлены паэтычны, больш ранні, пераклад.

Хрэстаматыйны верш «Краю мой родны! Як выкляты Богам…» успрымаецца сёння як праграмны ў кантэксце ўсёй грамадзянскай лірыкі паэта. Працяглы час ён быў у ліку асноўных рэпрэзентатыўных твораў пры дамінуючым сацыялагічным падыходзе да аналізу спадчыны класіка беларускай літаратуры. У Поўным зборы твораў М. Багдановіча друкуецца пад назвай, узятай з зачыннага радка (т. 1, 1992, с. 107).

Пры жыцці паэта верш публікаваўся некалькі разоў. Упершыню пабачыў свет у газеце «Наша ніва» 17 (30) верасня 1909 года — без назвы, за подпісам Максім Б–віч. Наступны раз гэты безназоўны твор быў надрукаваны на старонках «Беларускага календара "Нашае нівы" на 1912 год» (Вільня: Друкарня Марціна Кухты, 1912). Ім пачынаўся літаратурны раздзел названага выдання — «З Роднай Нівы», які складаўся з паэтычнай і празаічных частак.

У першай, паэтычнай, частцы побач з Багдановічавым былі змешчаны наступныя вершы (у парадку публікавання): «Жніво» Янкі Купалы, «Над калыскай» Якуба Коласа, «З чужыны» Цёткі, «Песня дзеўчаці» Андрэя Зязюлі, «Кабзар» Каруся Каганца, «Вецер» Алеся Гаруна. Далей ішлі ўзоры творчасці Канстанцыі Буйло, Цішкі Гартнага, Гальяша Леўчыка, Альберта Паўловіча і іншых аўтараў. Наўмысна прыводзім гэты пералік, каб падкрэсліць наступнае: перад чытачом паўставала разнайстайная палітра прыгожага пісьменства, плён творчасці мастакоў слова, якія вызначалі аблічча беларускай літаратуры пачатку XX стагоддзя.

Верш Багдановіча, адпаведны настрою эміграцкай масы беззямельнага сялянства з Аўстра-Венгерскай імперыі, упершыню займеў назву ў перакладзе на ўкраінскую мову (лакальны варыянт, адрозны ад літаратурнай), які быў апублікаваны ў паэтычнай калонцы газеты «Свабода» (укр. «Свобода») 19 лістапада 1914 года, найстарэйшым перыядычным выданні ўкраінскай эміграцыі, што бесперапынна выходзіць з 1893 года да нашага часу. У названым нумары газеты Багдановічаў верш быў змешчаны побач з падборкай чытырохрадкоўяў («Люди-б сонце заступили…», «Я так її люблю…», «Свою Україну любіть…», «І на оновленій землі…») і вершам-дыптыхам «Молитви» Тараса Шаўчэнкі:

**Чи зборемо горе?**
**(З білоруського).**

*Краю мій рідний! Як виклятий Богом —*
*Тілько ти зносиш недолї.*
*Хмари, болота... Над збіжем убогим*
*Вітер гуляє на волї.*

*Поруч там села розкинулись рідні.*
*Жалем стискаються груди!*
*Тополї, берези, хатини бідні.*
*І всюди понурії люди.*

*Страх, що зробили їх чорні руки,*
*Винесли сильні спини.*
*Сила примусила витерпіть муки*
*Пущі, розлоги, долини.*

*Кинь тільки оком ти до того люду,*
*Стиснеть ся серце від горя:*
*Тілько побачиш нещастя усюди*
*Смутку і сліз цїлі моря.*

*Пісня співає як вдовиції сина,*
*Йвася, коханє згубило,*
*Там, де понура схилилась калина, –*
*Бідного хлопця могила.*

*В казках-гутірках про щастє, про згоду*
*Серце новин не почує.*
*Здавило диханє народу,*
*Смуток усюди панує.*

*Филями скрізь розлило ся як море,*
*Рідний наш край затопило…*
*Братя! Чи зборем громадськеє горе,*
*Братя! Чи стане нам сили?!*

Падказкі адносна таго, з якім беларускім выданнем меў справу невядомы перакладчык, дае аналіз гэтых дзвюх публікацый. У «Нашай ніве» верш праходзіў за подпісам Максім Б–віч; у «Беларускім календары "Нашае нівы" на 1912 год» імя аўтара названа поўнасцю — Максім Багдановіч, як і ў перакладзе на ўкраінскую мову.

Канчатковую пэўнасць у адназначным першынстве календара дае тэксталагічны аналіз дзвюх публікацый верша. Першы радок нашаніўскай публікацыі «Край мой радзімы! Як выкляты Богам…» у наступнай перадрукоўцы мае іншы варыянт гучання – «Край ты мой родны! Як выкляты Богам…», што больш адпавядае ўкраінскаму перакладу: «Краю мій рідний! Як виклятий Богом…».

Паколькі імя пераклачыка зафіксавана не было, пытанне яго высвятлення патрабуе асобнага даследавання. На нашу думку, гэта можа быць Антон Латоцкі (укр. Антін Лотоцький; 1881—1949), пісьменнік, педагог, які цесна супрацоўнічаў з украінска-амерыканскай газетай «Свабода». З сабраных біяграфічных звестак вядома, што вучыўся ён на філасофскім факультэце Львоўскага ўніверсітэта, супрацоўнічаў з рэдакцыяй газеты «Діло», на старонках якой публікаваліся матэрыялы, прысвечаныя беларускай тэматыцы, найбольш змястоўным сярод іх было даследаванне «Адраджэнне беларускага пісьменства» Іларыёна Свянціцкага, якое ў 1908 г. выйшла ў Львове асобнай брашурай. На час вучобы прыпадае этап творчай сцверджанасці маладога аўтара і вызначэння тэматычных прыярытэтаў: выдадзена некалькі кніг, дамінуючай становіцца гістарычная тэматыка. Умацаванне патрыятычнага духу сярод моладзі з дапамогай твораў пра гераічнае мінулае продкаў прадвызначыць важную грамадскую ролю А. Латоцкага як дзіцячага пісьменніка ў час, калі яго родныя землі знаходзіліся ў складзе розных краін — Аўстра-Венгрыі, Польшчы, Савецкага Саюза, а кнігі выходзілі ва ўмовах розных дзяржаўных ідэалогій і нацыянальнай палітыкі. На схіле жыцця Антон Латоцкі быў прыняты ў Саюз пісьменнікаў Украіны.

**Мікола ТРУС**

# «Беларуская Еўропа»

**Цяжка не пагадзіцца, што тэма перакладаў — адна з самых важных у развіцці літаратуры. Творы замежных аўтараў часта друкуюцца ў нашай перыёдыцы, альманахах і зборніках. Час ад часу можна пабачыць паэзію, прозу і публіцыстыку айчынных пісьменнікаў на старонках замежных выданняў. Але рэдкасць — цэлы нумар альбо кніга.**

У венгерскім часопісе «*Naput*» («Сонечны шлях») пабачыў свет нумар пад назвай «Беларуская Еўропа». У Будапешце ён быў прэзентаваны яшчэ летась, а ў Беларусі прадстаўлены сёлета ў Дзяржаўным літаратурным музеі Янкі Купалы. З часопісам пазнаёмілі галоўны рэдактар Дзьёрдзь Сонды і перакладчык Петэр Барас, які большую частку жыцця правёў у Беларусі.

П. Барас адным з першых пачаў перакладаць творы беларускай літаратуры непасрэдна з мовы арыгінала, а не праз пасрэдніцтва рускай мовы. Па адукацыі — матэматык, паводле роду заняткаў — перакладчык: валодае дзевяццю мовамі. Дарэчы, беларуская літаратура так паўплывала на П. Бараса, што ён пачаў перакладаць з беларускай мовы ў той час, калі яшчэ з цяжкасцю размаўляў на ёй. Першыя пераклады з беларускай на венгерскую з'явіліся на старонках розных часопісаў у 2011—2012 гадах.

Мэта П. Бараса — пазнаёміць венгерскага чытача з творамі беларускай літаратуры, а таксама навучыць венгерскіх студэнтаў, якія цікавяцца нашай культурай, рабіць мастацкія пераклады. Нумар «*Naput*», прысвечаны гісторыі і культуры Беларусі, — яскравае ўвасабленне гэтай мэты. Як адзначыў перакладчык, змест часопіса склалі цалкам выпадковыя творы, якія, варта адзначыць, адпавядаюць густу самога П. Бараса: ад класікаў да сучаснікаў (Алесь Адамовіч, Васіль Быкаў, Святлана Алексіевіч, Людміла Рублеўская ды іншыя). Значнае месца заняла творчасць Янкі Купалы: прадстаўлены чатыры варыянты перакладу верша «А хто там ідзе?» і пераклад першай часткі п'есы «Тутэйшыя». Перакладчыкі адзначаюць, што п'еса вельмі складаная для перастварэння на іншыя мовы, бо яе тэкст пабудаваны акурат на перапляценні і супрацьпастаўленні літаратурнай беларускай мовы з гаворкамі і жаргонамі, для якіх уласцівыя польскія і рускія акцэнты і лексіка. Перакладчыкам даводзілася шукаць аналагічныя адпаведнікі ў венгерскай мове. Акрамя літаратуры, тэксты часопіса прысвечаны культуры, гісторыі і мастацтву Беларусі. Напрыклад, адзін з раздзелаў прысвечаны творчасці Міхаіла Анемпадыстава, Марка Шагала і іншых.

*Фота прадастаўлена Дзяржаўным літаратурным музеем Янкі Купалы.*

*Перакладчык Петэр Барас і рэдактар часопіса «Naput» Дзьёрдзь Сонды падчас прэзентацыі.*

— Для таго каб зрабіць літаратурны пераклад, акрамя ведання замежнай мовы трэба разумець той культурны асяродак, дзе з'явіўся твор, і родную мову, на якую перакладаеш, — адзначыў падчас прэзентацыі Петэр Барас. — Чытачы нумара пішуць лісты падзякі за тое, што даведаліся пра беларускую культуру, бо дагэтуль амаль нічога пра яе не ведалі. Канешне, на венгерскай мове ёсць пераклады беларускай літаратуры, але не зусім сучаснай: Купала, Колас, Быкаў, нават крыху Багушэвіча і Багдановіча. Толькі ўсе яны былі зроблены з рускай мовы.




Дарэчы, у 2017 годзе Беларусь і Венгрыя адзначылі 25-годдзе ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж краінамі. Развіццю гуманітарнага і культурнага супрацоўніцтва ўдзяляецца асаблівая ўвага. Так, на базе Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта вядзецца выкладанне венгерскай мовы, а ва Універсітэце Ларанда Этваша ў Будапешце выкладаюць беларускую мову. На прэзентацыі часопіса «*Naput*» пасол Венгрыі ў Рэспубліцы Беларусь Жолт Чутора ўручыў П. Барасу дзяржаўную ўзнагароду за ўнёсак у падтрыманне беларуска-венгерскіх стасункаў.

**Яўгенія ШЫЦЬКА**

# Мястэчка Пухавічы — у летапісе гісторыі

**У літаратурна-краязнаўчы летапіс пухавіцкай гісторыі дадалося яшчэ адно выданне — кніга Мікалая Каханоўскага «Пуховічы — жамчужына ў цэнтры Беларусі», якая ўбачыла свет у сталічным выдавецтве «Белпрынт».**

З ранейшых выданняў, якія прысвечаны гэтым мясцінам, можна ўспомніць кнігі Наталлі Ільініч пра Тальку, Зміцера Санько пра Азярычына, Наталлі Вайцяховіч пра Шацк, Станіслава Крэпскага пра Раўчак і ваколіцы.

Настаўнік-краязнаўца Мікалай Каханоўскі, які жыве ў вёсцы Пухавічы, сабраў вядомыя факты з яе гісторыі, звярнуўся да аповедаў землякоў, занатаваў розныя гісторыі, якія прыадкрываюць лёс старажытнага паселішча. У кнізе шмат ілюстрацый. Аўтар згадвае імёны людзей, якія нарадзіліся ў Пухавічах альбо нейкім чынам звязаны з лёсам паселішча.

Пухавічы, між іншым, — родны куточак для сям'я Смеяновічаў. Арнольд Фёдаравіч і Маргарыта Фёдараўна Смеяновічы (па мужу — Крашэўская) — родныя брат і сястра, чые лецішчы ў цэнтры мястэчка. Іх бацька — Фёдар Смеяновіч, афіцэр-дэсантнік, гераічна загінуў у Вялікую Айчынную вайну. Маргарыта Фёдараўна, якая, на жаль, ужо пайшла з жыцця, доўгі час працавала настаўніцай у Мар'інай Горцы. Два яе сыны — вайскоўцы. Адзін з іх — Віктар Крашэўскі, генерал-маёр. З сям'і Арнольда Фёдаравіча — дачка Вольга Рунова, вядомы ўрач-стаматолаг, кіраўнік адной з вядучых медыцынскіх устаноў Мінска. Сын Віталь Смеяновіч — кандыдат медыцынскіх навук, нейрахірург. Унучка Арнольда Фёдаравіча — Дана Рунова, мастачка, кніжны графік, аформіла шмат кніг беларускіх дзіцячых пісьменнікаў. Арнольд Фёдаравіч Смеяновіч — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар медыцынскіх навук, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, вядомы ў Беларусі і за яе межамі нейрахірург, ганаровы грамадзянін Пухавіцкага раёна.

У Пухавічах нарадзілася, закончыла сярэднюю школу член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса, галоўны рэдактар раённай газеты «Пухавіцкія навіны», аўтар паэтычных зборнікаў Вольга Савасцюк. Выпускнік Пухавіцкай СШ — генерал-лейтэнант Яўген Васільевіч Мікульчык, ганаровы грамадзянін Пухавіцкага раёна.

Са школай звязаны таксама імёны выпускніка дзесяцігодкі Мікалая Правалоцкага, чэмпіёна свету сярод юніёраў па біятлоне (1976 год), майстра спорту міжнароднага класа СССР. А таксама кампазітара Антона Валынчыка, які некаторы час выкладаў спевы і музыку ў Пухавіцкай СШ. Дырэктарам гэтай школы працавала член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь двух скліканняў Ала Васільеўна Ралькевіч, якая адзначана ордэнам Пашаны.

Мікалай Каханоўскі згадвае сярод знакамітых вучняў Пухавіцкай школы Герояў Савецкага Саюза Васіля Тарлоўскага і Мікалая Шута. Пагадзіцеся, далёка не ў кожнай школе вучыліся такія знакамітасці. Згадаем, што тутэйшую навучальную ўстанову ў другой палове XX ст. закончылі акцёр-купалавец Аляксандр Лабуш, доктар палітычных навук, кандыдат філасофскіх навук Мікалай Лабуш, кандыдат сельскагаспадарчых навук Аляксандр Матох, кандыдат хімічных навук Людміла Неронская…

Напрыканцы кнігі аўтар зазначае: «…колькі знакамітых, цікавых і таленавітых людзей нарадзілася ў мястэчку ў пасляваенны перыяд, але гэта асобная тэма для новага даследавання, вартага асобнай кнігі, якая абавязкова павінна будзе пабачыць свет». І далей: «Памылкай было б думаць, што карціна, якую я вам намаляваў на падставе сабраных мною матэрыялаў, не патрабуе ўдакладненняў, а высновы канчатковыя. Гэта далёка не так. Шматлікія сюжэты чакаюць дадатковых доказаў, абгрунтаванняў, так што кожны мае шанц стаць першаадкрывальнікам. Працэс пранікнення ў таямніцы гісторыі бясконцы». Сапраўды, з гэтым нельга не пагадзіцца. І Мікалай Каханоўскі, і яго наступнікі на краязнаўчай ніве здолеюць яшчэ шмат распавесці пра Пухавічы. А сёння мы маем магчымасць прачытаць кнігу руплівага збіральніка памятак даўніны Мікалая Каханоўскага. Дарэчы, раю перагарнуць яе старонкі яшчэ і для таго, каб атрымаць адказ на пытанне, чаму ўсё ж такі краязнаўца піша «ПухОвічы», а не «ПухАвічы».

**Алесь КАРЛЮКЕВІЧ**

# Вызначаны пераможцы

**літаратурнай прэміі Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта імя У. А. Калесніка**

Дзявятая па ліку цырымонія ўзнагароджання адбылася ў сценах Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. С. Пушкіна. Для выдатнага педагога, крытыка і даследчыка літаратуры, пісьменніка Уладзіміра Калесніка родным на ўсё жыццё стаў філалагічны факультэт.

Літаратурная прэмія прысуджаецца адзін раз на два гады за высокі ўзровень мастацкіх твораў, якія ўзбагачаюць духоўнае жыццё і нацыянальную культуру Брэстчыны. У намінацыі «Паэзія» лаўрэатамі сталі Георгій Тамашэвіч за кнігу «Анёл над Брэстам: вянок санетаў» і Уладзімір Лебедзеў за паэтычны зборнік «Росная трава». У намінацыі «Проза» вызначыўся пісьменнік-фантаст Сяргей Белаяр са зборнікам навукова-фантастычных апавяданняў «Расследаванні інспектара Сарвы».

Трох лаўрэатаў вылучылі ў намінацыі «Дзіцячая літаратура». Высокую ўзнагароду атрымалі казачніца Кацярына Мядзведзева за кнігу «Разламашкі майстра Люфта» і аўтары паэмы «Пушчанскія дзівы» — браты Анатоль і Васіль Дэбішы.

Далейшых поспехаў творцам пажадалі прадстаўнікі Брэсцкага аблвыканкама, члены Савета па прысуджэнні прэміі — загадчык кафедры беларускага літаратуразнаўства Брэсцкага дзяржуніверсітэта Уладзімір Сенькавец і Тамара Данілюк, якая доўгі час узначальвала Брэсцкую абласную бібліятэку імя М. Горкага.

Павіншаваць пераможцаў прыйшлі юныя артысты — пераможцы абласнога і рэспубліканскага этапаў «Жывая класіка», творчая моладзь Брэстчыны.

**Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ**

# ФОРМУЛА ПОСПЕХУ

## Асаблівасці творчай кухні Алесі Скорабагатай

Мастачку Алесю Скорабагатую нячаста сустрэнеш на свецкіх тусоўках. Яна аддае перавагу ўласна мастацтву, а не размовамі пра яго. У сваёй майстэрні Алеся працуе карпатліва, не зважаючы на дзень тыдня і час сутак. Менш слоў, больш справы — своеасаблівы дэвіз і тая самая запаветная формула яе поспеху. 30 лістапада ў галерэі «Арт-Беларусь» адкрыўся выставачны праект мастачкі «Дактыласкапія», дзе аўтар прадставіла каля сарака работ, якія наглядна дэманструюць асаблівасці яе творчага стылю.

Алеся Скорабагатая на «Восеньскім салоне» пяць гадоў запар атрымлівала прыз сімпатый гледачоў. Гэты факт даказвае, што мастачка змагла заваяваць аўтарытэт у арт-асяроддзі. Безумоўна, яе работы адны з самых пазнавальных на мастацкім рынку Беларусі. Экспазіцыя, прадстаўленая ў галерэі «Арт-Беларусь», даказвае, што ўнутраны запал мастачкі незгасальны.

Абавязкова стаць мастачкай Алеся вырашыла ўжо ў дзесяць гадоў. Уласна, гэта нікога і не здзівіла. Усе шпалеры ў кватэры былі размаляваныя, «даставалася» кнігам і ўсяму, што трапляла дзяўчынцы пад руку. Ды і настаўнікі настойліва рэкамендавалі бацькам аддаць Алесю ў каледж мастацтваў. Туды таленавітую дзяўчынку прынялі без экзаменаў. Уласна, як і ў акадэмію. Усё дзякуючы конкурсам, у якіх Скорабагатая была нязменна ў тройцы прызёраў.

— Мне заўсёды падабалася маляваць, таму ніякіх іншых варыянтаў, кім быць, і не ўзнікала. У мяне нават захаваўся дзіцячы запіс са школы (на занятках кожны вучань павінен быў сказаць, кім ён хоча стаць). Я сказала, што хачу стаць мастачкай, — расказвае Алеся Скорабагатая. — Так яно і атрымалася. Заставаліся, вядома, ваганні, калі разважала, што трэба можа, заняцца чымсьці іншым. Але так, напэўна, у кожнага. Мая любоў да мастацтва ўсё перамагла.

Мастачка расказвае, што падчас першых сваіх выставак вельмі хвалявалася, а цяпер ёй больш падабаецца назіраць за рэакцыяй наведвальнікаў. Алеся прызнаецца, што натхненне можа знайсці абсалютна ва ўсім: няхай гэта будзе асьміног на прылаўку крамы, мудрагелістае дрэва або пацешная гульня святла. Любы прадмет можа стаць асновай яе новага шэдэўра.

Да крытыкі Алеся навучылася ставіцца спакойна. Яшчэ на пачатку шляху яна мела для мастачкі вялікае значэнне. Цяпер жа ўсё залежыць, ад каго сыходзіць крытыка. Яна стараецца прыслухацца да меркавання прафесіяналаў і пастаянна вучыцца. Мастацтвазнаўцы называюць работы мастачкі сапраўднай паэзіяй. Ёсць на творах аўтарскі знак — адбітак пальца Алесі і яе подпіс.

Звыклыя рэчы ў тым ці іншым спалучэнні на палотнах аўтара могуць разыгрываць невялікія прадстаўленні — сцэнкі са штодзённасці, такія знаёмыя і зразумелыя нам, або асаблівыя падзеі. Падобныя кампазіцыі з прадметаў эмацыянальна насычаны, перадаюць шырокую гаму чалавечых перажыванняў. Тут і драма, і пяшчотная рамантыка, і добрая ўсмешка, і эстэтычнае, гастранамічнае задавальненне, цёплыя ўспаміны. І рэчы — ужо не проста рэчы, а знакі і сімвалы. Некаторыя аўтарскія назвы да карцін падкрэсліваюць настрой, які мастачка хоча выказаць сваімі кампазіцыямі. Работы Алесі Скорабагатай адлюстроўваюць высокі ўзровень майстэрства, дасягнуты дзякуючы карпатлівай працы і ідэйнасці.

— На самай справе ўспрыманне мастацтва — працэс дастаткова просты. Не трэба слухаць, што вакол гавораць пра мастакоў і карціны, — упэўнена мастачка. — Проста трэба пайсці на выстаўку, пахадзіць, паглядзець і адчуць: унутры водгук будзе. Калі нешта падабаецца, то яно падабаецца і будзе прыцягваць. У карцін ёсць свая энергетыка, таму абавязкова трэба хадзіць на выстаўкі, каб яе адчуць.

Тэматычна і жанрава творчасць Алесі Скорабагатай разнастайная. Але ж з партрэтамі мастачка працуе толькі ў тым выпадку, калі гэтага хоча заказчык. Іншая справа — выявы святых. Мастачка малюе абразы, і гэта, бадай, адзін з самых складаных жанраў. Падчас працы над абразом трэба трымаць пост, а перш чым брацца за напісанне святых, абавязкова атрымаць благаславенне. Адзін з абразоў у мастачкі купіў касцёл у Польшчы, але часцей такія работы яна піша па просьбе знаёмых, а не па замове царквы.

Зараз Алеся выкладае ў Акадэміі мастацтваў і пераканана, што беларуская мастацкая адукацыя аўтара не ламае, а часцей дае волю. Карціны мастачкі сёння знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі, Музеі сучаснага мастацтва ў Беларусі. Яе работы таксама захоўваюцца ў прыватных і музейных калекцыях Беларусі, Расіі, Германіі, Польшчы, Францыі, В'етнама, ЗША, а дыпціх «Ноч» і «Дзень» знаходзіцца ў Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Азербайджане.

**Вікторыя АСКЕРА, фота аўтара.**

# Надзея БУКА: «ГАЛОЎНАЕ БАЧЫЦЬ СЭРЦА»

**Надзя Бука — мастачка, пісьменніца і ілюстратар. Яна мае свой уласны стыль — буцінанку. Яе работы можна ўбачыць не толькі на выстаўках, але і на... звычайным адзенні ў гарадскім асяроддзі. Як Надзея Бука ў такім маладым узросце змагла адшукаць індывідуальны стыль у творчасці і што ўжо шмат гадоў натхняе яе на цікавыя праекты, мастачка расказала карэспандэнту «ЛіМа».**

**— Надзя, вельмі цікава, як вы стварылі сваю першую буцінанку?**

— Я вучылася ў Маладзечне ў каледжы. Там прайшла школу выцінанкі — гэта выразанне ажурных узораў з каляровай паперы. Мая настаўніца Вікторыя Мікітаўна Чырвонцава навучыла ствараць карціны пры дапамозе звычайнай каляровай паперы. Але калі прыйшоў час навучанне заканчваць, у нас усіх былі дыпломныя работы. Мая дыпломная — цэлы шэраг ілюстрацый да кнігі ўласных вершаў. Гэта былі выразаныя чорна-белыя кампазіцыі, але ўжо не выцінанкі, таму што не мелі ніякай сіметрыі, не было традыцыйнага беларускага сімвалізму, а толькі сюррэалізм. І вось менавіта тады я стварыла свае першыя буцінанкі, як я іх потым і назвала. Тады мне здавалася, што гэта таксама выцінанкі, толькі незвычайныя. Памятаю, атрымала 10 балаў за ілюстрацыі, якіх было каля 20 (2001 год).

**— Колькі часу ствараеце адну буцінанку?**

— Па-рознаму. Напрыклад, калі работа невялічкая, дні тры, а калі вялікая — амаль месяц. Залежыць ад складанасці працы. Увогуле, немагчыма падгадаць, за колькі зробіш. Мастакі — людзі творчыя, працэс залежыць ад многіх фактараў.

**— Тады цікава даведацца, а што ўсё ж такі вас натхняе?**

— Людзі. Гэта галоўная крыніца. Калі паразмаўляю з чалавекам, прыходжу і адразу пачынаю нешта замалёўваць. Яшчэ натхняюць творы іншых мастакоў. У мяне ёсць некалькі любімых аўтараў, таму нярэдка наведваю Мастацкі музей, галерэю. Ад іх бяру шмат, але гэта не значыць, што капірую іх творы — проста яны даюць імпульс. Гэта, напрыклад, Сальвадор Далі, Рэнэ Магрыт, Марк Шагал, Файбіш-Фрага Царфін, Хаім Суцін, Рафаэль, Мікеланджэла. Яшчэ мяне натхняюць новыя месцы, куды еду раз-пораз, каб змяніць абстаноўку. Гэта можа быць Вільня або нейкая вёска, дзе не будзе знаёмых людзей, дзе я змагу хадзіць адна, глядзець на прыроду, нюхаць кветкі.

**— Ці бывае ў вас праблема творчага крызісу? Як спраўляецеся з ёю?**

— Бывае. Гэта вялікая праблема для мастака. У мяне быў аднойчы творчы крызіс тры гады. Я наогул не брала алоўка, думала, што развучуся маляваць, але гэты навык нікуды не знікае. Калі наступае крызіс, я звычайна пераключаюся на іншыя заняткі. І потым натхненне прыходзіць у пэўны момант, калі гэта сапраўды патрэбна. Бог заўсёды ведае, калі даць чалавеку настроіцца на важную работу. Я гэта адчуваю і вельмі яму ўдзячна.

**— Надзя, а якія ўмовы вам неабходны для камфортнага творчага працэсу?**

— Па-першае, каб гучала музыка — абавязкова. Без музыкі не стварыла ніводнай сваёй карціны. Звычайна гэта рок-кампазіцыі. Трэба, каб ніхто не перашкаджаў. У мяне няма сваёй майстэрні: усе карціны малюю, потым выразаю дома. Але раблю гэта ноччу ці позна вечарам, калі дзеці спяць.

Натхненне — абавязковая ўмова. Ніколі не сяду ствараць буцінанку, калі няма натхнення, адчування, што табе гэта патрэбна *«ici et maintenant»* (тут і зараз). І калі такі момант наступае, магу ўсе справы адкласці, сесці маляваць.

**— Што самае галоўнае ў працэсе работы? Чаму ўдзяляеце больш увагі?**

— Задума — галоўнае, бо калі не будзе яе, не будзе і твора. У мяне часта бывае так: намалюю скетч, праходзіць год-два-тры, і тады толькі магу ўжо гэтую карціну зрабіць са скетча, а можа прайсці і пяць гадоў. Калі ёсць скетч, будзе твор. Калі скончацца ідэі, то, напэўна, як мастак памру. Але ў мяне іх шмат.

**— Як знайсці сваю індывідуальнасць у мастацтве?**

— Да свайго стылю я ішла шмат гадоў. Яго складана знайсці ў прынцыпе. Вельмі важна для мастака, каб твой стыль адрозніваўся ад іншых. Усе мы можам вызначыць работы Марка Шагала, калі прыходзім у карціную галерэю. Мой стыль таксама адрозніваецца. Адразу заўважаеш у галерэі, што гэта Надзя Бука. Мая творчая манера ўжо сфарміравалася, і гэта вельмі прыемна: я магу лічыць сябе прафесіяналам.

**— Якія парады дадзіце тым, хто хоча звязаць жыццё з мастацтвам?**

— У Экзюперы ў «Маленькім Прынцы» ёсць такі выраз: «Галоўнае вачыма не ўбачыш, галоўнае бачыць сэрца». І я так лічу. Калі адчуваеш сэрцам, што павінен маляваць, што гэта твой дар ад Бога, што можаш ісці гэтым шляхам, то ніколі не здраджвай сабе. Не трэба слухаць бацькоў, што мастак не можа зарабіць грошай. Трэба слухаць толькі сябе і тое, што кажа Бог, і маляваць. Заўсёды павінна быць практыка. Чым часцей вы малюеце, тым больш досведу назапашваеце, цікавейшымі атрымліваюцца вашы творы.

**— Як праходзіць ваш звычайны дзень?**

— Я прачынаюся а 8-й або 9-й гадзіне раніцы. Муж заводзіць малодшага сына ў дзіцячы садок. Потым у мяне сняданак, абавязкова з кавай. Потым — зарадка. Затым залажу ў сацыяльныя сеткі, не таму, што мне трэба паглядзець, што там робіцца, а таму, што я іх вяду: у *Facebook*, *Instagram* касцёла Св. Роха на Залатой Горцы, у які хаджу, маёй студыі пры касцёле. Таксама ў пошце гляджу заказы на ілюстрацыі. Потым малюю або іду на дзелавую сустрэчу ці заняткі. Пасля правяраю ўрокі ў сваіх дзяцей. Затым зноў малюю да дзвюх гадзін. У мяне няма выхадных. І мне ў нейкай ступені гэта падабаецца.

**Гутарыла Алеся ДАВІДОВІЧ**

# Эксперымент + пластычнасць

## у пастаноўках студэнцкіх калектываў з розных краін свету

**Беларуская тэатральная публіка кожную восень чакае яркіх прэм'ер і падзей. Адна з іх — фестываль студэнцкіх тэатраў «Тэатральны куфар», які прайшоў у Мінску шаснаццаты раз з 19 па 24 лістапада. За такі доўгі час існавання фестываль стаў значнай падзеяй як у нашай краіне, так і далёка за яе межамі, пра што сведчыць геаграфія краін-удзельніц 2019 года. Сучасны маладзёжны тэатр у Мінску прадставілі калектывы з усяго свету: Інданезія, Непал, Грузія, Беларусь, Польшча, Украіна, Расія, Францыя, Эстонія.**

*Спектакль «Ураджай».*

### КАНЦЭПЦЫЯ

«Тэатральны куфар» кожны год заяўляе пра сябе якім-небудзь яркім перформансам. Паўтарацца — не ў стылі ўдзельнікаў форуму. Вось і на гэты раз яны вырашылі здзівіць. Адышлі ад традыцыйных тэатральных жанраў і падрыхтавалі ўнікальныя пластычныя пастаноўкі — на іх і зрабілі акцэнт. Убачыць пастаноўкі можна было на 4 пляцоўках сталіцы: у ліцэі і арт-прасторы БДУ, клубе *Hide*, Рэспубліканскім палацы культуры прафсаюзаў.

### ГУЧНЫ СТАРТ

На адкрыцці тэатральнага свята з вітальным словам да акцёраў, гасцей і гледачоў звярнуўся прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях БДУ Іван Янушэвіч, які пажадаў удзельнікам фэсту плённай працы, поспехаў і адзначыў, што адзіны студэнцкі тэатральны фестываль у краіне дазваляе зразумець думкі моладзі, адчуць яе светапогляд. Таксама на цырымоніі зачыталі прывітальны адрас міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь Ігара Карпенкі.

«Правядзенне «Тэатральнага куфра» стала добрай традыцыяй. Шаснаццаты раз БДУ прыняў на сваёй пляцоўцы таленавітыя тэатральныя калектывы з усяго свету. Упэўнены, сёлетні форум тэатральнага мастацтва ўжо даў новы імпульс развіццю творчага супрацоўніцтва паміж моладдзю розных краін і прыцягнуў увагу да нашай рэспублікі як да сучаснай культурнай сталіцы. А гледачы атрымалі магчымасць убачыць самую шырокую палітру тэатральных фарбаў і справядліва ацаніць талент маладых акцёраў і стваральнікаў спектакляў».

### ПРАЕКТЫ

Сёлета «Тэатральны куфар» быў сапраўды на вышыні. Праграма здзіўляла разнастайнасцю. У асноўнай праграме — 11 спектакляў, амаль палова — пластычныя. Гэта галоўны акцэнт у межах спецыяльнага праекта «Куфар_пластылін». Былі і іншыя.

«КуфарДрамаЛаб» заключаўся ў тым, што рэжысёр фестывалю і тэатра «На балконе» БДУ Андрэй Саўчанка падрыхтаваў серыю чытак твораў сучаснай беларускай драматургіі. Аднак замест звычайнага чытання п'есы расказвалі пра яе. У першы дзень новыя тэксты маладых аўтараў прадставіла лабараторыя «Адкрывачка» Цэнтра беларускай драматургіі (куратар Дзмітрый Багаслаўскі). У другі дзень тэатралы пачулі п'есы Паўла Касцюкевіча і Вольгі Раманавай.

«Куфар-*in-Motion*» — праект, які прадугледжваў стварэнне тэатральнай пастаноўкі на працягу фестывалю. За працу ўзялася сябра журы, педагог-харэограф, рэжысёр маладзёжнага тэатра «Кола» і галоўны рэжысёр Цэнтра культуры «Віцебск» Уладзіслава Цвікі. Яна правяла для ўдзельнікаў серыю трэнінгаў, прысвечаных спалучэнню руху і гуку. Вынікам стала пластычная мініяцюра, якую паказалі артысты на цырымоніі закрыцця.

### ПЕРАМОГІ

Удзел у фестывалі ўзялі як аматарскія, так і прафесійныя калектывы. А ў апошні дзень гледачоў чакаў асаблівы падарунак — спектакль аднаго з найлепшых тэатраў Грузіі: Тбіліскага дзяржаўнага тэатра кінаакцёра імя М. Туманішвілі «Лысая спявачка» паводле п'есы Э. Іанеска.

Ацэньвалі пастаноўкі тэатральныя эксперты з розных краін. Старшыня журы — дэкан факультэта мастацтваў і гуманітарных навук Універсітэта Дэ Манфорт (Вялікабрытанія) прафесар Роб Бранен. Пераможцаў вызначылі ў пяці намінацыях як сярод прафесійных калектываў, так і аматарскіх. Да прафесійных адносяцца тэатральныя школы, дзе рыхтуюць акцёраў і рэжысёраў, а таксама дзейныя тэатры.

Дарэчы, журы адзначыла, што аб'яднанне аматараў і прафесіяналаў ідзе заўсёды на карысць і ўдзельнікам, і фестывалю. У студэнтаў ёсць магчымасць паназіраць за працай дасведчаных акцёраў, прафесіяналы ў сваю чаргу могуць убачыць жывое эмацыянальнае стаўленне да тэатра. Гран-пры конкурсу вызначалі шляхам глядацкага галасавання.

Такім чынам, Кубак фестывалю атрымалі пастаноўкі «*Factum fatum*» тэатра «Карман» Кузбаскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта (г. Кемерава, Расія) і «Наш дом» тэатра «*Nasza Kamienica*» (г. Лодзь, Польшча). Тэатры-пераможцы таксама ўдастоены і іншых узнагарод «Куфра». Так, «*Nasza Kamienica*» адзначаны спецыяльным прызам журы «За шчырасць і прафесіяналізм», а тэатр «Карман» перамог у намінацыі «Найлепшая сцэнаграфія».

«*Factum fatum*» — пластычны спектакль пра тое, як і што ўплывае на лёс чалавека. Бо нават самы звычайны чалавек — складаны механізм, у якім ужываецца велізарная колькасць часам зусім процілеглых якасцяў. Кожны дзень адбываецца шмат падзей — значных і не вельмі, велізарных і амаль непрыкметных. І любая, нават самая нязначная, можа скіраваць жыццё ў зусім процілеглы бок. Як гэта адбываецца? Чалавек — сам творца свайго лёсу ці ўсё ж такі існуюць сілы, якія дапамагаюць нам у гэтым?

Гэты спектакль — штуршок для разважанняў, для асэнсавання ўласнага «я» ў вялікім свеце. Тут акцёры паказалі сінтэз эмоцый чалавека, яго ўнутраную сутнасць праз знешнія арыенціры.

Другі спектакль-пераможца «Наш дом» пабудаваны цалкам на асацыятыўным мысленні. Акцёры паказалі, як у жудасных лодзінскіх кватэрах жахліва жывуць такія ж жудасныя людзі. Скрозь сцены іх кватэр чутны тэлефонныя званкі і асабістыя размовы. Яны мараць, аддаюцца ўспамінам, жартуюць. Рэжысёр прапанаваў ненадоўга зазірнуць у іх пакоі і клопаты, даведацца, пра каго думаюць галоўныя героі, паслухаць гісторыі, якія дзеці расказваюць у двары, адчуць, як у гэтых кватэрах пахнуць і гудуць летнія ночы.

Гэта гісторыя пра мірны дом і яго тонкія сцены. Яна заварожвае сваім меланхалічным рухам. У спектаклі складана адчуць дынаміку, але тут ёсць эфект гіпнозу, незразумелага ўцягвання эфектам дымнасці і туману ва ўнутраныя канфлікты герояў. Такія спектаклі глядзець цяжка менавіта да таго моманту, пакуль у адным з герояў не пазнаеш сябе. Калі гэта адбываецца, сэнс дзеяння на сцэне набывае новае значэнне.

Пастаноўку «Аўтобус» студэнцкага тэатра «Арт» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта журы адзначыла як «Самы шматспадзеўны тэатр». Тут таксама гледачам прапанавалі спектакль, дзе на першым месцы не ўражанні, а аналіз.

У сюжэце — пасля працоўнага дня людзі вяртаюцца дадому ў аўтобусе. Праз некаторы час адзін з пасажыраў заўважае, што аўтобус ідзе не па сваім маршруце і кажа пра гэта астатнім. Але ніхто не звяртае ўвагі. Усе паглыблены ў сябе. Толькі пасля таго, як кіроўца страчвае прытомнасць, — людзей апаноўвае занепакоенасць. Пасажыры пачынаюць высвятляць не што здарылася з чалавекам, а куды ідзе аўтобус...

І тут пачынаецца сапраўдны хаос, не зразумелы гледачу. Спачатку высветлілася, што кіроўца шукаў булачную, бо не паспеў купіць дадому хлеба. Потым ён перадумаў і вырашыў паехаць у Плевен пабачыцца з маці. А пасля і зусім аказалася, што кіроўца піў гарэлку, і звычайная паездка ператварылася ў небяспечнае падарожжа. Пасажыры пачынаюць прыводзіць вадзіцеля да прытомнасці. Але гэта не дае ніякага выніку. І толькі пасля таго, як ледзь не забіваюць аднаго з пасажыраў, аўтобус спыняецца і паварочвае назад.

Здавалася б, аповед абсурдны. Але ў гэтым выпадку студэнцкі тэатр «Арт» прапаноўвае ўбачыць, наколькі ў грамадстве пачалі збівацца арыенціры. Аўтобус — толькі прыклад, невялікая форма стварэння канфлікту, у больш глабальным сэнсе такую сітуацыю можна пабачыць практычна кожны дзень.

Пераможцы ў наступнай намінацыі — творчае аб'яднанне «*DIY*-тэатр» (г. Харкаў, Украіна), якое назвалі «Найлепшым акцёрскім ансамблем». Яны ў пластычнай драме «Забаронены плод» узнялі тэму пераемнасці пакаленняў.

Спектакль паставілі па матывах казкі «Чырвоны капялюшык», але ператварылі ў псіхадэлічны аповед. Юная і таленавітая дзяўчынка пачынае жыццёвы шлях з адкрытай душой і поўным кошыкам яблыкаў, але казка хутка заканчваецца... Гэта гісторыя трох жаночых пакаленняў, звязаных кроўнымі сувязямі. Хтосьці з іх павінен памерці, каб працяг стаў магчымы. У працэсе выбару з'яўляецца шмат незразумелых момантаў і аспектаў, з-за якіх складана выратаваць жыццё галоўнай гераіні.

Перамогі ў іншых намінацыях журы размеркавала наступным чынам: за «Найлепшую рэжысуру» і «Найлепшы спектакль аматарскага тэатра» адзначаны спектакль «Ураджай» студэнцкага тэатра Тарту (Эстонія) (рэжысёр Калеў Куду). «Найлепшы спектакль прафесійнага тэатра» — у тэатральнай майстэрні «Студыёзы» Беларускага дзяржаўнагаўніверсітэтакультурыімастацтваў (г. Мінск) з пастаноўкай «Музыка свету» (рэжысёр Вячаслаў Сашчэка).

Прыз за найлепшую мужчынскую ролю падзялілі два акцёры: Ёнас Ватэр (студэнцкі тэатр Тарту са спектаклем «Ураджай») і Станіслаў Шадзько (студэнцкі тэатр «АРТ» Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта з пастаноўкай «Аўтобус»). У намінацыі «Найлепшая жаночая роля» перамагла Анабель Берг (студэнцкі тэатр Тарту са спектаклем «Ураджай»).

**Вікторыя АСКЕРА**

### Даведка «ЛіМа»

Фестываль «Тэатральны куфар» — праект Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, прытым адзін з найбольш буйнамаштабных. Фэст ладзіцца з 2004 года на зайздрасць рэгулярна і дае магчымасць студэнцкім тэатральным калектывам паказаць, на што яны здольныя.

«Тэатральны куфар» моцна адрозніваецца ад аналагічных праэктаў, якія ажыццяўляюцца ў іншых краінах. У беларускім фестывалі акцэнт зрабілі на пераходзе адакадэмічнага студэнцкага тэатра да прафесійнага. Фестываль носіць статус міжнароднага нездарма. У ім удзельнічаюць студэнцкія тэатральныя калектывы больш чым з 55 краін свету блізкага і далёкага замежжа, дарэчы, бывалі на фестывалі госці з Паўночнай і Паўднёвай Амерык, Афрыкі, Азіі. Толькі дзякуючы правядзенню гэтага фестывалю ў многіх ВНУ з'явіліся свае тэатральныя калектывы.

Кожнаму калектыву, які прыязджае на фестываль, даюць магчымасць выступіць на сцэне са сваім спектаклем, тэматыка якіх самая розная: ці гэта шэкспіраўскі «Гамлет», ці незвычайнае прачытанне Бродскага. На сцэне дазваляецца эксперыментаваць.

# Прэм'еры Вялікага

## Святочны снежань аб'яўлены ў Тэатры оперы і балета

**Апошні месяц года ў Вялікім тэатры оперы і балета — перыяд самых відовішчных спектакляў і канцэртаў. Сімвалічна, што перад навагоднімі святамі ў сценах тэатра сапраўды пачынаюць збывацца мары. Чалавек трапляе ў казку і адчувае чараўніцтва. У гэтым нумары мы прадстаўляем ТОП-5 самых яркіх падзей, якімі будзе здіўляць на працягу месяца Вялікі.**

**1.** 8 снежня на сцэне Тэатра оперы і балеты пакажуць прэм'еру легендарнага балета «Стварэнне свету» ў новай рэдакцыі Валянціна Елізар'ева.

Як прызнаецца балетмайстар, ён з натхненнем працаваў над спектаклем разам са сваімі выдатнымі суаўтарамі — кампазітарам Андрэем Пятровым, дырыжорам Уладзімірам Машэнскім, мастаком Яўгенам Лысікам. Дарэчы, Андрэй Пятроў спецыяльна для Вялікага тэатра стварыў музычную рэдакцыю спектакля. У арыгінале гэта трохактны балет, але кампазітар так натхніўся задумай Валянціна Елізар'ева, што нават дапісваў нейкія фрагменты. А на прэм'еры ў Мінску ў 1976 годзе, віншуючы артыстаў і пастаноўшчыкаў, Андрэй Пятроў не мог схаваць эмоцый і сказаў, што гэты спектакль можна назваць, бадай, самым удалым з усіх, што на той момант існавалі ў Савецкім Саюзе і за мяжой.

Новую рэдакцыю балета, які жыве на гэтай сцэне ўжо 43 гады, немагчыма назваць неактуальнай. І гэта не дэкларацыя, не пераказ важных тэзісаў, а жывая, яркая, мнагазначная вобразная рэальнасць. Балет адгукаецца на найважнейшую праблему сучаснасці — пратэстуе супраць пагрозы вайны, апявае магутнасць чалавека і вечную сілу мацярынства. Гэта ўвасабляецца ў поліфанічным узаемадзеянні музычна-жывапісна-харэаграфічных тэм балета.

**2.** 12 снежня операй «Князь Ігар», грандыёзная прэм'ера якой адбылася сёлета ў верасні, у Вялікім тэатры пачнецца X Мінскі міжнародны Калядны оперны форум.

Цяперашняя пастаноўка стала шостым зваротам тэатра да знакамітай партытуры Барадзіна. У творчай біяграфіі дырыжора-пастаноўшчыка Аляксандра Анісімава розных рэжысёрскіх чытанняў оперы не менш. Новая версія «Князя Ігара» будзе прынцыпова адрозніваецца ад усіх папярэдніх. Маэстра Анісімаў не ўтойвае: гэтае рашэнне шмат у чым прадыктавана знаёмствам з Ганнай Булычовай — расійскай музыказнаўцай, якая працуе са спадчынай Аляксандра Барадзіна.

Абноўленая партытура «Князя Ігара» павінна зацікавіць не толькі шырокую публіку, але і прафесіяналаў, бо музычны матэрыял оперы, асабліва фрагментаў, адрэдагаваных ці дапісаных Мікалаем Рымскім-Корсакавым і Аляксандрам Глазуновым, быў значна перапрацаваны і, больш за тое, папоўніўся новымі старонкамі аўтарства Барадзіна, якія раней у оперу не ўваходзілі. Залогам жа мастацкай мэтазгоднасці і драматургічнай цэльнасці новай партытуры з'яўляецца багаты канцэртны досвед маэстра Анісімава ў галіне жанравага пераасэнсавання малавядомых, няпоўных або няскончаных твораў.

**3.** 15 снежня на сцэне Вялікага тэатра пакажуць оперу ў трох дзеяннях «Турандот» Джакома Пучыні. У 2013 годзе рэжысёр Тэатра оперы і балета Міхаіл Панджавідзэ прадставіў на сцэне тую версію пастаноўкі, у якой была выкарыстана музыка, напісаная самім Пучыні, гэта значыць, без заключнай сцэны. І вось праз нейкі час Міхаіл Аляксандравіч вырашыў змяніць канцэпцыю, дадаўшы фінальную сцэну на музыку Альфана. Кампазітар стварыў грандыёзныя харавыя сцэны, што вылучаюцца складанай музычнай мовай, партыямі, разлічанымі на моцныя галасы. Тэмбральна багатыя, цудоўныя па сіле і палкасці, гэтыя сцэны нагадваюць па размаху і эфектнасці харавыя оперы рускіх кампазітараў і ўяўляюць для рэжысёра і артыстаў неверагодна цікавы матэрыял для выканання.

Асаблівасцю беларускай пастаноўкі з'яўляецца тое, што яна сцэнічная: усе акцёры апрануты ў касцюмы, сцэна аздоблена маштабнымі дэкарацыямі. У пікавы момант спектакля задзейнічана больш за 200 акцёраў. Вялікае значэнне мае хор. У гэтай оперы ён з'яўляецца адной з дзеючых асоб, а дакладней — народам, які выказвае свой гнеў альбо ласку.

**4.** Аперэта ў трох дзеяннях «Лятучая мыш» пройдзе ў межах X Мінскага міжнароднага Каляднага опернага форуму 16 снежня.

«Лятучая мыш» унікальная. Аперэце аўстрыйскага кампазітара Іагана Штрауса (сына) амаль паўтара стагоддзя, а яна не знікае з вядучых сцэн свету. Больш за тое, атрымаўшы ў савецкі час нечакана ўдалае ўвасабленне, твор стаў яшчэ больш папулярны.

Складаныя лабірынты, паваротны круг, незвычайныя візуальныя эфекты, цікавая харэаграфія — у дзеянні ўсё працуе для ўвасаблення задумы.

Галоўныя партыі аперэты выконваюць вядучыя салісты: Анастасія Масквіна, Ірына Кучынская, Алена Сіняўская, Алена Таболіч, Марына Ліхашэрст, Клаўдзія Пацёмкіна, Дзіяна Трыфанава, Марына Аксянцова, Васіль Мінгалёў, Аляксандр Краснадубскі, Сяргей Лазарэвіч, Аляксандр Міхнюк, Аляксандр Гелах і іншыя.

У нашым тэатры «Лятучую мыш» паставіў вугорскі рэжысёр Міклаш Габар Керэні, больш вядомы як Керо. І гэта невыпадкова. Пачынаў ён як оперны рэжысёр, на радзіме ставіў «Лятучага галандца» Вагнера, «Макбета» Вердзі, «Фаўста» Гуно і іншыя пастаноўкі. Пазней, ужо будучы мастацкім кіраўніком, дырэктарам і рэжысёрам Будапешцкага тэатра аперэты і мюзікла, перайшоў у іншы жанр: «Каралева Чардаша» і «Графіня Марыца» Кальмана, «Краіна ўсмешак» Легара і, вядома ж, «Лятучая мыш» Штрауса. Сёння Міклаш Габар — мастак свету. Яго спектаклі ідуць у Зальцбургу, Празе, Вене, Тэль-Авіве, Бухарэсце, Мюнхене, Санкт-Пецярбургу. У апошнім, дарэчы, таксама «Лятучая мыш».

**5.** Яшчэ адным важным сюрпрызам для прыхільнікаў оперы стане паказ 21 верасня «Яўгенія Анегіна». Новая рэдакцыя пастаноўкі была прадстаўдена яшчэ ў 2012 годзе, але да сённяшняга часу на кожным паказе «Яўгенія Анегіна» ў тэатральнай зале — аншлаг.

Дырыжор-пастаноўшчык спектакля-аднаўлення — народны артыст Беларусі Аляксандр Анісімаў, рэжысёр рэдакцыі — Аляксандр Прахарэнка, хормайстар-пастаноўшчык — народная артыстка Беларусі Ніна Ламановіч, мастак-пастаноўшчык — Дзмітрый Мохаў.

На беларускай сцэне было падрыхтавана пяць пастановак «Яўгенія Анегіна». Гэтая опера стала першым творам рускай класікі, пастаўленым у 1933 годзе на сцэне тэатра, і затым неаднаразова паўставала ў розных дырыжорскіх інтэрпрэтацыях і рэжысёрскіх версіях. У цяперашняй пастаноўцы задзейнічаны вядучыя майстры беларускай сцэны.

Як адзначае народны артыст Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Расіі, галоўны дырыжор Нацыянальнага сімфанічнага аркестра Беларусі Аляксандр Анісімаў, з партытурай «Яўгенія Анегіна» яму даводзілася мець справу неаднойчы, і кожны раз ён з хваляваннем адкрывае яе старонкі і з вялікай радасцю ўспамінае кожную пастаноўку. Творца адзначае, што на фоне багатага досведу працы з гэтай партытурай вяртанне да яе ў беларускім Вялікім тэатры — заўсёды вельмі інтрыгоўна і цікава.

**Матэрыялы паласы падрыхтавала Вікторыя АСКЕРА**

# Імпульсам медыйнага нерва

## Ці могуць тэхналогіі пахіснуць якасць журналістыкі?

**Сёння кожны, у каго ёсць смартфон, можа генерыраваць медыйны кантэнт і аказваць уздзеянне на аўдыторыю. І такіх — сотні. Дастаткова ведаць, як падаць свой матэрыял у *Telegram*, падтрымліваць акаўнт у *Instagram*, «кідаць фоткі, заліваць відосы»… Сучасная журналістыка? Стужкі навін сёння часта напаўняюць нядобранадзейныя так званыя агрэгатары, пускаючы ў масы фэйкавыя навінавыя салюты. Між тым этыка, адказнасць для журналіста была першачарговай ва ўсе часы, але сёння, думаецца, гэтае пытанне абвастрылася асабліва. Бо тэлеграм-каналам не замінае скарыстаць чужы кантэнт без спасылкі на крыніцу… Як ратаваць сітуацыю? Дзе месца прафесійнага журналіста? Гэтыя турботы — поле для дыскусіі і абмеркавання VII Форуму маладых журналістаў «Развіццё айчыннай журналістыкі на сучасным этапе і яе адказнасць перад грамадствам» на факультэце журналістыкі БДУ.**

### АДКАЗ КАНАПНЫМ ЭКСПЕРТАМ

Сацыяльныя сеткі сёння прэтэндуюць на цэнтральныя пазіцыі, выцясняючы СМІ і канкурыруючы з імі. Калі аналізаваць долю карыстальнікаў сацыяльніх сетак у Беларусі, то на першым месцы — «УКантакце» (43%), на 2-м — «Аднакласнікі» (36%), *Instagram* — 27%, *Facebook* — 15%, *Twitter* — 6,5%. Дайшло да таго, што інфармацыю з сацсетак акумулююць пэўныя структуры. Так, былы галоўны рэдактар найбуйнейшага інфармацыйнага агенцтва *Lenta.ru* Галіна Цімчанка стварыла інтэрнэт-выданне *Meduza*. Галіна Цімчанка гаворыць, што гэта інфармацыйны пражытачны мінімум. З навін у сацсетках выбіраюць найбольш запатрабаваныя і транслююць на *Meduza*. Дзе тут праца журналіста? Спецыялісты-агрэгатары маніторяць па сацсетках навіны і выкладваюць на створаны партал. Прыкмета новых медыя? Але ці аб'ектыўныя тут навіны?

«Сёння медыя фарміруюць не толькі наша ўяўленне пра рэальнасць, але і фактычна мадэлююць саму рэальнасць, сцэнарый і дынаміку падзей нацыянальнага і міжнароднага ўзроўню, — адзначае намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Андрэй Кунцэвіч. — Сама інфармацыйная прастора мяняецца літаральна на вачах. Яшчэ некалькі гадоў назад складана было ўявіць, што *YouTube* стане сур'ёзным канкурэнтам вялікага тэлебачання, а блогі і каналы мэсэнджараў будуць адчувальна ўздзейнічаць на навінавы парадак рэгіёнаў і цэлых краін. Такія трансфармацыі спараджаюць няпростыя пытанні. Як супрацьстаяць лавінам фэйкавых навін з сумніўных крыніц? Якое месца прафесійнага журналіста ў сучасным грамадстве?»

Адказнасць перад грамадствам — гэта галоўнае, што адрозніваe журналіста ад любога іншага суб'екта стварэння інфармацыі, перакананы Андрэй Кунцэвіч. Нягледзячы на імклівае змяненне фарматаў, галоўныя задачы і функцыі сапраўднай журналістыкі застаюцца нязменныя. Як і 10, 50 і 100 гадоў таму, журналіст павінен памятаць пра сваю галоўную місію — пошук ісціны, служэнне грамадству, у якім жывеш. «Пры гэтым журналісты павінны ісці ў нагу з часам, медыйнымі трансфармацыямі, якія адбываюцца сёння. Можна бясконца доўга скардзіцца на тое, што ў мінулае сыходзяць такія жанры, як фельетон, ці на тое, што блогеры адцягваюць на сябе ўвагу чытача, якога рэдакцыя напрацоўвала гадамі. Але калі сучасная аўдыторыя хоча глядзець відэа, чытаць мультымедыйныя гісторыі, мець зносіны ў інстаграме, СМІ павінны навучыцца працаваць у такіх фарматах і рабіць гэта эфектыўна», — лічыць Андрэй Кунцэвіч. Па яго меркаванні, голас маладых журналістаў павінен быць грамчэй і аўтарытэтней меркавання канапных экспертаў і блогераў: «У нашым імкліва змяняльным свеце заўсёды памятайце, што сапраўдная журналістыка — гэта любоў і ўвага да людзей, да звычайнага чалавека».

### ТЭХНАЗАЯЦ СУПРАЦЬ ЧАРАПАХІ

«Часы змяніліся крута. Да такой ступені, што на ролю ўладароў дум прэтэндуюць не адзінкі, а сотні-тысячы як адказных майстроў слова, так і тых, хто такім хоча здавацца. І ў другіх мэты не заўсёды высокія, — занепакоены намеснік міністра інфармацыі Рэспублікі Беларусь Ігар Бузоўскі. — Ва ўмовах глабальнай інфарматызацыі, узрослай дынамікі ўсіх сацыяльных працэсаў асноўная роля ў фарміраванні каштоўнасных арыентацый асобы і грамадства пераходзіць да медыякультуры. І СМІ сёння маюць каласальнае значэнне. Менавіта медыякультура і СМІ, кантэнт інфармацыйных рэсурсаў становяцца асноўнымі інструментамі развіцця культуралагічнага складніка сацыяльных працэсаў. Небывалыя дагэтуль шырокія магчымасці для кантролю за свядомасцю і паводзінамі грамадзян даюць глабальная інфарматызацыя і камп'ютарызацыя. Гэтыя з'явы робяць тэхнічна магчымым кіраваць масавай свядомасцю і паводзінамі. СМІ сталі магутным сродкам і мэтанакіраваным інструментам палітычных меркаванняў, парадкаў».

На 1 лістапада 2019 года ў Беларусі зарэгістравана 1616 друкаваных СМІ, 725 газет, 850 часопісаў, 273 тэлерадыёвяшчальныя СМІ, 3000 замежных друкаваных СМІ, 20 сеткавых выданняў. І гэта не згадваючы пра інтэрнэт-рэсурсы... «Мы ўваходзім у прынцыпова новае інфармацыйнае поле, прынцыпова новыя гістарычныя падзеі. Калі гаварыць пра ўзаемадзеянне дзяржаўных структур, СМІ, то дзяржаўны бюракратычны механізм можна супаставіць сёння з чарапахай. А што яна ў параўнанні з тэхназайцам, які рэгулюе працэс так, што за ім паспець немагчыма. Мы павінны знаходзіць новыя формы работы як СМІ, так і дзяржаўных структур», — сцвярджае Ігар Бузоўскі. СМІ, кіруючы сацыяльнымі працэсамі, такім чынам, становяцца не сродкам масавай інфармацыі, а сродкам масавага ўздзеяння, адным з фактараў гарантавання нацыянальнай бяспекі, мяркуе намеснік міністра інфармацыі. На жаль, актыўна распаўсюджваецца практыка мэтанакіраванага, у тым ліку негатыўнага, знешняга інфармацыйнага ўздзеяння.

### АКАЎНТ — ПЕРШАКРЫНІЦА?

Паказальная, у прыватнасці, рэклама ў інтэрнэце: дастаткова адзін раз паглядзець, колькі каштуе, напрыклад, пуцёўка ў Турцыю, як на ўсіх сайтах, якія вы наведваеце, будзе з'яўляцца турыстычная рэклама пад вас. Чым гэта дрэнна? Самападман: вас не забяспечваюць аб'ектыўнай інфармацыяй. Чалавек не бачыць карціны. Таму ці надзейныя новыя медыя?

Нядаўна ў нашай краіне прайшоў Форум па кіраванні інтэрнэтам *Belarus IGF*. Эксперты ўжо не гавораць пра сайты СМІ, сацсеткі, а канстатуюць, што крыніца інфармацыі — тэлеграм-канал. Інтэрнэт разглядаецца як медыя, прытым медыяспажыванне змяняецца: акаўнты сацсетак прэтэндуюць на галоўную першакрыніцу інфармацыі. Напрыклад, тэлеграм-канал «Топор — горячие новости» мае 700 тысяч падпісчыкаў. Трафік інтэрнэт-сайтаў фарміруецца не з галоўнай старонкі і не з лаяльнай аўдыторыі, якая кожную раніцу пачынае з таго, што ўбівае назву выдання ў пошукавік, а са стужак навін — з агрэгатараў. У ТОПе Яндэкса стаіць навіна — яе прачыталі, а ці задумаліся, адкуль яна?

Якая вага тэлеграм-каналаў? Галоўны рэдактар *Russia Today* Маргарыта Сіманьян дае інтэрв'ю аднаму з тэлеграм-каналаў, у якога 250 тысяч падпісчыкаў. Трэнд найноўшых медыя? Даць інтэрв'ю невядома каму… Ці маюць тэлеграм-каналы прыстойную рэпутацыю? Дзе этыка, калі кантэнт крадзецца і не ўказваецца спасылка на крыніцу? І па якім законе разбірацца? Ці не катастрофа гэта, што грунтуецца на маральных, прафесійных асновах? Дзе тут прафесійная этыка журналіста ў адносінах да крыніцы мэсэнджараў?

Дарэчы, у беларускім інтэрнэце (агульная колькасць карыстальнікаў інтэрнэту ў Беларусі — 4 млн) 49% людзей сядзяць у мэсэнджарах, 44% — у сацыяльных сетках, 33% карыстаюцца навінавымі інтэрнэт-рэсурсамі. Усяго 700 тысяч беларусаў пастаянна чытаюць навіны на інфармацыйных рэсурсах краіны — аўдыторыя невялікая. Такім чынам, ідзе моцная барацьба за трафік. 19% у інтэрнэт-рэсурсах — гэта блогеры; розныя спецыялізаваныя інтэрнэт-рэсурсы займаюць 17%. На першым месцы сярод мэсэнджараў у нашай краіне — *Viber* (65%), *Skype* — 20%, *WhatsApp* — 17%, *Telegram* — 13%, *Facebook* як мэсэнджар — 5,8%.

### МУХ АД КАТЛЕТ

«Мы — пакаленне *digital, Y* і *Z,* а нам на пяткі наступае пакаленне *A* —тыя, хто нарадзіўся пасля 2010 года і хто ўжо сёння аказвае ўздзеянне ў інфармацыйным асяроддзі, — заўважае першы сакратар ЦК ГА "БРСМ" Дзмітрый Варанюк. — Тэрмін журналістыка 2.0. з'явіўся ў пачатку 2000-х, калі інтэрнэт толькі развіваўся. 2020 год — час падводзіць вынікі: прайшло два дзесяцігоддзі новых інфармацыйных тэхналогій».

Ці паспяваем мы сёння за тэхналогіямі? Старэйшае пакаленне ўсё яшчэ чытае газеты, паглынае інфармацыю з тэлебачання, ды большасць сучаснікаў гартаюць стужку *Twitter* і *Telegram* — і менавіта адтуль бяруць самыя свежыя навіны. Як не пераацаніць уздзеянне блогераў? «Сёння ідзе барацьба за падпісчыкаў: ад гэтага нараджаецца лаяльнасць. Пакаленне *A* (пасля 2010 г.н.) і пакаленне *Z* (2000 г.н.) лепш аддзяляюць мух ад катлет, лепш арыентуюцца ў прасторы, — разважае Дзмітрый Варанюк. — Мы даследавалі ступень даверу маладых да інфармацыі: каб паверыць, дзеці пераправяраюць у *Google*, Вікіпедыі, яшчэ некалькіх крыніцах. Іншая справа — калі біць у эмацыянальную цэль. Пра што гэта гаворыць? Мяняюцца сродкі падачы інфармацыі, але людзі тыя ж, каштоўнасці тыя ж». Ва «УКантакце» бывае, што 50 розных чалавек штосьці актыўна каментуюць, а калі даследаваць акаўнты, *IP,* аказваецца, гэтыя 50 чалавек і процьма каментарыяў — толькі 4 камп'ютары ў адным месцы. Такім чынам, сёння некалькі чалавек могуць зрабіць так, каб у любой сетцы ў каментарыях з'явілася сфарміраванае меркаванне. Таму дзе мяжа: чаму давяраць, а чаму — не? Як у гэтым акіяне лавіраваць і адстойваць свой пункт погляду? «Трэба прымяняць самыя сучасныя тэхналогіі, пачынаючы ад раённай газеты, заканчваючы маштабам тэлебачання, — перакананы Дзмітрый Варанюк. — Замежныя калегі — рэдактары газет Вялікабрытаніі, ЗША не імкнуцца ўсё пераводзіць у электронны фармат ці цалкам у сацсеткі. Сёння павінна быць усё разам: і актыўна развітая сацсетка, і інтэрнэт-партал, і добрае папяровае выданне. Сённяшні журналіст — гэта вобраз жыцця. Сёння з'яўвіўся новы выхавальнік — інтэрнэт. Менавіта ён дае маладым паняцце добра/дрэнна. Як? Лайкамі. Шмат праглядаў, каментарыяў — значыць, гэта добра, бачыць дэзлайкі — дрэнна. Мы не павінны праходзіць міма такой несправядлівасці, у тым ліку ў інтэрнэце. І актыўна ўдзельнічаць лайкамі, дэзлайкамі, каментарыямі. У *YouTube* сёрфяць 5-гадовыя дзеці. Журналіст — асоба з высокай мараллю. І сёння варта паказваць у інтэрнэце, што добра, а што дрэнна».

### ШТО, КАЛІ НЕ ЧЫТАЮЦЬ?

«Журналістыка ўжо не мае права (калі толькі вы не лаўрэат Нобелеўскай прэміі) існаваць адно як прадукт ("Я штосьці напісаў") — трэба думаць, як гэта падаць. Інакш можна самадастаткова сядзець і гаварыць, што "нашу газету чытаюць мільёны", — упэўнены намеснік генеральнага дырэктара УП "Агенцтва «Минск-Новости»", старшыня камісіі па этыцы ГА "Беларускі саюз журналістаў" Дзмітрый Партон. — Сёння я прыходжу на канферэнцыю Яндэкса і думаю: ці тая ў мяне адукацыя? Бо канферэнцыя для медыя. І калі ты не ведаеш, пра што гавораць Яндэкс-медыя, ты, вядома, можаш быць Паўстоўскім… Але не факт. Хай гэта гучыць крыўдна».

Сёння навідавоку змаганне за трафік. Вайна *Facebook* з *YouTube* заключаецца ў тым, што калі вы на *Facebook* дадзіце ў пасце спасылку на ютуб-канал, вас адразу пачнуць паніжаць. Такая ж канкурэнтная барацьба сацсетак са СМІ: зараз сацыяльныя сеткі знішчаюць спасылкі на СМІ, не хочуць, каб чытач пераходзіў на чужыя рэсурсы. Маўляў, рабіце ўсё што заўгодна ў рамках сацсеткі: здымайце фільм, стварайце блог, але нікуды больш не выходзьце. Многія буйныя карпарацыі *(BBC)* адмовіліся ад уключэння свайго кантэнту ў сацсеткі. Расія разглядае буйныя інтэрнэт-парталы як агрэгатары.

Хто такі журналіст цяпер і што такое СМІ? Не разабраўшыся ў гэтым, не зразумеем, што такое этыка журналіста. Хтосьці выказаў такую думку: журналіст — гэта тры пазіцыі: той, хто сам сябе ім лічыць; каго лічаць такім чытачы; каго калегі прызнаюць за свайго…

«Дзе б журналіст ні пісаў: у тэлеграм-канале ці ў сацсетках — ён заўсёды павінен заставацца прафесіяналам. Дырэктар *BBC* калісьці адзначыў, што супрацоўнікаў у сацсетках быць зусім або не павінна, або яны мусяць весці там рэдакцыйную палітыку канала», — прывёў прыклад Дзмітрый Партон.

Думаецца, пры велізарнай разнастайнасці магчымасцей падачы кантэнту ўсё ж у аснове — мы самі, наша этычнае разуменне нормы. Яшчэ Чэхаў разважаў: апусціцца да чытача ці ўзнімаць яго да сябе. Вядома, узнімаць.

Сёння папулярны рэйтынг: убачыў крутую навіну — хутка адрэйціць, і ты ў ТОПе. А хтосьці працуе доўга, скрупулёзна і скардзіцца: «Я пішу добра, але мяне не чытаюць? Чаму?» Выжыванне кантэнту, на жаль, у многім знаходзіцца сёння ў руках тэхналогій. Такія рэаліі. Таму, відавочна, нельга журналісту заставацца па-за тэхналогіямі, але і ці варта ім цалкам падпарадкоўвацца?

**Наталля СВЯТЛОВА**

Скарбонка Спадчыны

Фота з архіва Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра.

*Рэгіна Саловіч, жыхарка Адэльска, прадстаўляе «Пызы» са шкваркамі.*

# Адэльскія прысмакі

## За прастатой страў — досвед многіх пакаленняў

Набліжаюцца доўгачаканыя калядна-навагоднія святы. Многія гаспадыні загадзя клапоцяцца пра тое, як найлепш пачаставаць гасцей. Адны цікавяцца заходнееўрапейскай кухняй, другія кідаюць вока на кітайскія прысмакі (маўляў, што ўпадапае белы пацук, год якога імкліва набліжаецца). Мы ж раім звярнуць увагу на нашы старадаўнія стравы.

Напрыклад, у аграгарадку Адэльск (калісьці гэта было мястэчка, бо Адэльск меў Магдэбургскае права) Гродзенскага раёна шмат добрых гаспадынь. Іх хлеб і пірагі, вяндліну і клінковы сыр ведаюць не толькі ва ўсёй акрузе, але і па-за межамі аграгарадка, а турысты з задавальненнем дэгустуюць гэтыя стравы. У аснове харчавання большасці тутэйшых сем'яў — самабытныя і ўнікальныя стравы. Прыгатаванне кожнай праходзіць пэўныя этапы, заснаваныя на старажытных тэхналогіях, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне і захоўваюцца стараннямі як вяскоўцаў, так і работнікаў мясцовай культурнай сферы. Стравы дзеляцца на паўсядзённыя (бабка, жытні хлеб), святочныя (капытцы, бігас, цымас, клінковы сыр) і абрадавыя (ламанцы).

Асабліва разнастайная ежа з «другога» хлеба: перш за ўсё бульбяная бабка і дранікі, а яшчэ «пызы», кішка бульбяная, запечаная бульба. Для адэльскай кухні характэрна, па-першае, пераважнае выкарыстанне цёртай, а не цэлай бульбы. Па-другое, існуе некалькі спосабаў прыгатавання бульбяной масы. І, па-трэцяе, абавязкова прымяняецца камбінаваная цеплавая апрацоўка. Цэлай бульбу ўжываюць толькі ў трох відах — варанай у мундзірах, тушанай і печанай.

— Старыя рэцэпты, з аднаго боку, простыя, а з другога, — унікальныя па смакавых якасцях, — зазначыла вядучы метадыст па рабоце ў галіне традыцыйнай мастацкай культуры, нематэрыяльнай культурнай спадчыны і фальклору Гродзенскага раённага культурна-інфармацыйнага цэнтра Наталля Рамановіч. — Клінковыя сыры з хатняга малака вырабляе Марыя Іодэль, шляхетны хлеб пякуць Тэрэза Шупіцкая і Рэгіна Саловіч, адмысловыя стравы гатуе Гелена Барцэвіч. А Мар'яна Кандрусевіч падчас фальклорных экспедыцый падзялілася з работнікамі культуры сямейным абрадам выпякання хлеба, а тыя ў сваю чаргу занатавалі яго, адрадзілі і дэманструюць цяпер турыстам. Значнае месца на стале жыхароў Адэльска займаюць мясныя стравы, асабліва свініна і свіное сала. Мясцовая прымаўка сцвярджае: «Як няма рыбы смачней лінінкі, дык няма мяса дабрэй свінінкі». Гатуюцца ў асноўным стравы з буйных кавалкаў мяса вышэйшай якасці. Не абыходзяць гаспадыні ўвагай хатнюю птушку, асабліва гусей.

— А гусей у Адэльску славяць па-асабліваму, тым больш падчас свята млынароў, якое адрадзілі работнікі культуры ў 2013 годзе, — працягвае Наталля Іосіфаўна. — 11 лістапада тут святкуюць Дзень святога Марціна — заступніка млынароў. Традыцыйна з гэтай нагоды мясцовыя жыхары ладзілі кірмаш, адпачывалі і весяліліся. А яшчэ збіралі падаткі, а, як вядома, тыповым «плацежным сродкам» вяскоўцаў заўсёды былі гусі. Менавіта таму традыцыйна спажывалі спецыяльна прыгатаваную запечаную гусяціну «птушку Марціна», дзяліўшы яе на каменным млынавым крузе паміж усімі прысутнымі. Страву падавалі з віном, капустай і печанай бульбай. Аднак сёння Дзень святога Марціна адзначаюць не толькі смакаваннем гуся, але і дэгустацыяй маладога віна. Менавіта гэты дзень афіцыйна прызнаецца днём віна новага ўраджаю, а леташняе віно з гэтага моманту лічыцца старым.

Адэльчане надавалі гадаванню і ўтрыманню птушкі шмат увагі. Прынамсі, індыкам давалі чарвякоў, жукоў і мурашыныя мяшэчкі, курам падмешвалі ў корм сухую крапіву, гусей паілі кляновым сокам. Часам, каб хутчэй адкарміць гусей, іх пускалі пасля першых маразоў на ўсходы жыта, дзе яны хутка набіралі вагу.

— Але мала выгадаваць добрую птушку на мяса — трэба было яе правільна перапрацаваць і захаваць, — заўважае Наталля Рамановіч. — Нашы продкі часцей за ўсё мяса салілі, марынавалі, вэндзілі і замарожвалі. Адэльская даўняя кулінарыя ведала нямала страў з гусяціны. Любілі найбольш гуся, засмажанага ці запечанага цалкам, — адну з разнастайнасцяў «пячыстага», ці гуся, «надзяванага» кашай з грыбамі.

Мяса сярэдняй якасці таксама выкарыстоўваюць, але толькі невялічкімі кавалкамі ў мяса-агароднінных і мяса-грыбных стравах. Прасоленае свіное мяса з'яўляецца самастойнай стравай. Сала любяць злёгку падвэнджанае, са скуркай. Ужываюць яго халодным — рэжуць тонкімі лустачкамі, закусваюць цыбулінай альбо часнымкам. Выкарыстоўваюцца і вантробы. Славіцца Адэльск вэнджанымі каўбасамі і паляндвіцамі. Вяскоўцы запэўніваюць, што з дроў лепш за ўсё для іх прыгатавання падыходзіць яблыня. А своеасаблівая вяндлярня — укапаная ў зямлю жалезная бочка — ёсць амаль на кожнай сядзібе.

Мясцовыя жыхары з радасцю не толькі пачастуюць самабытнай ежай, але і навучаць яе гатаваць. Чатыры гады таму «Традыцыйная рэгіянальная кухня аграгарадка Адэльск Гродзенскага раёна Гродзенскай вобласці» была ўнесена ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. Пры падтрымцы Гродзенскага райвыканкама ўбачылі свет тры невялікія кнігі «Местачковыя прысмакі», «Усё не бяда — калі ёсць хлеб ды вада», «Кухня з водарам традыцый» і перакідны каляндар «Рэцэпты лепшых адэльскіх страў» з серыі «Адэльская спадчына» са старадаўнімі рэцэптамі.

— Некаторыя з паўсядзённых і святочных страў, якія рыхтуюцца па традыцыйных народных рэцэптах, прымеркаваны да традыцыйнага календара, — зазначае Наталля Рамановіч. — На Каляды (першая посная куцця) па сёння ў Адэльску гатуюць ламанцы, як старэйшыя носьбіты мясцовай культуры, так і маладыя. Цымас, капытцы, бігас і іншыя стравы выкарыстоўваюць амаль ва ўсе каляндарныя святы (Зялёныя святкі, Вялікдзень, Янаў дзень і інш.).

**Раіса МАРЧУК**

**Выходзіць з 1932 года**

**Заснавальнікі:**
**Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»**

**Галоўны рэдактар**
**Аляксей Іванавіч ЧАРОТА**

**Рэдакцыйная калегія:**
Таццяна Арлова
Алесь Бадак
Дзяніс Барсукоў
Віктар Гардзей
Уладзімір Гніламёдаў
Вольга Дадзіёмава
Жана Запартыка
Анатоль Казлоў
Анатоль Крэйдзіч
Віктар Кураш
Алесь Марціновіч
Вячаслаў Нікіфараў
Мікалай Чаргінец
Іван Чарота
Іван Штэйнер

**Адрас рэдакцыі:**
**Юрыдычны адрас:**
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

**Адрас для карэспандэнцыі:**
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

**Тэлефоны:**
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснік галоўнага рэдактара — 377-99-72
адказны сакратар — 377-99-72
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 377-99-72
бухгалтэрыя — 287-18-14

Выходзіць раз на тыдзень па пятніцах.

**Падпісныя індэксы:**
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Выдавец:**
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Павел Якаўлевіч СУХАРУКАЎ

Нумар падпісаны ў друк
05.12.2019 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 941

**Друкарня** Рэспубліканскага ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр. Незалежнасці, 79.
Індэкс 220013

Заказ — 3776

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.